Пролетары ўсіх краін, аб'ядайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарк'ому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдаўня—XV
№ 342 (4248)
Субота, 26 сьнежня 1931 г.

МЕНСК, Савецкая 93

Сёньня ў нумары

АБ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧЫМ ПЛЯНЕ НА 1932 ГОД — Даклад старшыні СНК СССР тав. МОЛАТАВА на другой сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР (1-я, 2-я і 3-я стар.).

АБ УЗМАЦНЕНЬНІ БАРАЦЬБЫ З УХІЛАМІ Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПЫТАНЬНІ — Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б (3-я стар.).

Н. ГОРДЗІН — Менск павінен паказаць узор барацьбы з аўтаномарнасьцю, за правільны вулічны рух (4-я стар.).

Апрацаваны лён — на загатоўчыя пункты (3-я стар.).

Арганізацыя пладова-гародніх і бульбяных таварных калгасных фэрм — забытая галіна работы (4-я стар.).

ПОЛЬШЧА. Польская ваеншчына за «работай» (4-я стар.).

Аб народна-гаспадарчым пляне на 1932 год

Даклад старшыні СНК СССР тав. МОЛАТАВА на другой сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР

I. СССР і капіталістычныя краіны ў мінулым годзе

Таварышы, пад канец году прынята падводзіць вынікі. Гэта ня кепскі звычай, асабліва калі сканцэнтраваць увагу на асноўных фактах. Вынікі 1931 г. у адносінах капіталістычных краін і Савецкага Саюзу надзвычай поучальны. Усе краіны капіталізму былі ахоплены крызісам небывалай сілы, прычым крызісам, які ўсё наглыбляецца. Усе гэтыя краіны каціліся далей з гарой, скарачаючы свае вытворчасьць, згортваючы будаўніцтва, выкідваючы ўсё новыя мільёны галодных на вуліцу.

Побач з гэтым у Савецкім Саюзе адбываўся гаспадарчы ўздым, рост працуючых сіл ня чуваных у сьвеце маштабаў. Прамысловасьць за гэты перыяд зрабіла новы буйнейшы крок наперад. Будаўніцтва разгарнулася ня толькі ў старых, але і ў новых галінах гаспадаркі. Становішча мас як ў горадзе, так і ў вёсцы значна палепшылася. Процілегласьць шляхоў разьвіцьця краін капіталізму і краіны дзе будуецца сацыялізм раскрылася з яшчэ большай яснасьцю і вострасьцю. Шлях капіталізму—шлях крызісу, шлях гаспадарчага заняпаду і выключных труднасьцяй для народных мас. Шлях сацыялізму — шлях росту, шлях гаспадарчага ўздыму і карэннага паляпшэньня становішча шырокіх мас гораду і вёскі. У капіталістычных краінах—вялізарныя мільённыя армеі беспрацоўных, пагаршэньне павялічэньне ліку галодных і галечы ў гарадох і ў вёсках. У СССР — ліквідацыя беспрацоўя і канчатковы падрыў дыфэрэнцыяцыі і галечы сярод працоўных мас вёскі.

Прыведу адзнаку вынікаў мінулага году, даную ў самым апошнім дні адной буржуазнай навукова-эканамічнай установай у Берліне. У апошнім «агляде» інстытуту кан'юнктурных дасьледваньняў за трэці квартал 1931 г. дана такая-ж агульная характарыстыка сусьветнага эканамічнага разьвіцьця за 1931 год, асабліва ў сувязі з абвостраным у гэтым эканамічнага крызісу валютным і крэдытным крызісам. У гэтым «агляде» гаворыцца наступнае:

«39 краін, якія ахапляюць звыш паловы сусьветнага гандлю — 54% охоплены валютным крызісам, або непасрэдна стаяць пад пагрозай такавога. Пад уплывам гэтага крызіснага абвастрэньня ў крэдытнай сфэры сусьветны кан'юктурны ўпадак у апошнія месяцы зноў абвастрыўся. Прамысловая прадукцыя ва ўсіх краінах, за выключэньнем СССР, далей падала, індэкс сусьветнай прамысловай прадукцыі (1928—100 зьнізіўся з 83,3 у чэрвені на 79,4 у кастрычніку бягучага году».

Прыведу яшчэ неалькі вытрымак з гэтага «агляду» за трэці квартал мінулага году. «Агляд» устанаўляе: «сусьветны гандаль зьнізіўся прыблізна да ўзроўню 1913 году», г.зн. да таго ўзроўню, якога яна дасягнула, пры кладна, 20 гадоў таму назад». Вывад зьнізіўся (параўноўваецца трэці з другім кварталам — Б.М) амаль на ўсіх эўрапейскіх краінах, і толькі СССР змог далей павялічваць свой імпарт нават вышэй адносна высокага ўзроўню папярэдняга кварталу». «У трэцім квартале эканамічная дэпрэсыя падала далей ва ўсіх краінах, апрача СССР». «Зноў СССР стаў па-за агульным працэсам упадку. Прамысловая прадукцыя СССР зноў моцна павысілася». «У ПАЗШ гаспадарка знаходзіцца пад уплывам [illegible] банкаўскага і крэдытнага крызісу. У бліжэйшы час пералому чакаць ня прыходзіц да. Спыненьня ўпадку прадукцыі чакаць нельга».

Можна было-б падаць яшчэ рад цытат аб становішчы ў Англіі, Францыі і іншых краінах і ўсё ў тым-жа духу. Нарэшце, прыведу з гэтага «агляду» асноўныя паказальнікі эканамічнага разьвіцьця Германіі ў 1931 годзе:

1. Прамысловая прадукцыя ў Германіі зьнізілася да сучаснага моманту да ўзроўню 1890 г., г. з. адкацілася на 40 гадоў назад.

2. Доля цяжкай індустрыі ў агульнай прамысловай вытворчасьці Германіі ўпала за гэты год з 59 на 45 проц., а гэта падтвердзе самы фундамант прамысловасьці і ўсёй народнай гаспадаркі.

3. Капіталаўкладаньні ў будаўніцтва склалі ў гэтым годзе ўсяго 4,5 мільярда марак супроць 8,9 мільярдаў марак у 1928 годзе. За апошнія трохгодзьдзе капіталаўкладаньні зьніжаюцца з году ў год, што вядзе да падрыву гаспадарчага разьвіцьця Германіі, прынамсі яшчэ на рад год.

4. Даход працоўнага насельніцтва Германіі за апошні год будзе на 6 мільярдаў меншым, чым за папярэдні год. Усяго за апошнія два гады працоўны даход рабочых і служачых Германіі зьменшыўся з 43 мільярдаў марак у 1929 годзе да 33-34 мільярдаў марак у 1931 годзе, г. зн. зьменшыўся за два гады на 9-10 мільярдаў марак.

5. Нацыянальны даход Германіі ўпаў з 75,4 мільярда марак у 1928 годзе да 55 мільярдаў марак у мінулым годзе.

Прыведу яшчэ ўзятыя з друку асобныя прыклады таго, у якіх матар'яльных і бытавых умовах жывуць цяпер германскія рабочыя. Вось пара фактаў, узятых з друку апошніх дзён. «Вось, напрыклад, высокакваліфікаваны дрэваапрацоўшчык 41 году. Ён жанат, мае 3 дзяцей ва ўзросьце 5, 9 і 11 год. Летам мінулага году ён зарабляў у сярэднім каля 35 руб. у тыдзень. З тых часоў яго зарплата зьнізана больш, чым на 20 проц., а за таго-ж ён працуе толькі 24 гадзіны ў тыдзень. Заработак не перавышае цяпер 13-14 р. За вычэтам кватэрнай платы, у распараджэньні сям'і з 5 чалавек застаецца 6-7 руб. у тыдзень на ежу, асьвятленьне, апаленьне, вопратку і ўсе іншыя расходы. Рэзультат ясны—сям'я асуджана на голад і холад. Вось другі прыклад.

Рымар, які (пачасьлівае выключэньне) працуе з поўнай нагрузкай. У мінулым годзе ён зарабляў у тыдзень каля 30 руб., цяпер—ня больш 24 руб. Ён жанат і мае ва сваім утрыманьні калеку бацьку. На ўсіх траіх за вычэтам кватэрнай платы і розных абавязковых узносаў, застаецца ў тыдзень каля 10 руб». (Известия ЦИК СССР», 9 сьнежня).

Падобнага роду прасьцейшыя прыклады маюць таму бясспрэчна важнейшае значэньне, што ўмовы жыцьця паказаных вышэй рабочых-дрэваапрацоўшчыка і рымара зьтлюмачэнцца цяпер тыповымі для мільёнаў рабочых Германіі, дый ня толькі Германіі. Дадайце да гэтага, што ў Германіі, як і ў іншых капіталістычных краінах, ёсьць на неалькі мільёнаў беспрацоўных, што жывуць на жабрачых дапамогах, а народка зусім пазбаўленых нават гэтых дапамог. Прыведзеных фактаў даволі для таго, каб паказаць, да якіх межаў дайшло эканамічнае разбурэньне ў Германіі і якія выключныя цяжкасьці крызіс узваліў на плечы працоўных. Але ня толькі ў Германіі — краіне пераможнай—крызіс робіць такое руйнуючае дзеяньне на народную гаспадарку і на становішча мас. І іншыя капіталістычныя краіны коцяцца ўніз па той-жа сьцежцы. Прыведу яшчэ пададзенае наведамленьне паконт становішча ў адной з буйнейшых краін Паўднёвай Амэрыкі—у Бразыліі, насельніцтва якое дасягае 42 млн. чалавек. «30 млн. чалавечых істот павольна паміраюць у Бразыліі ад голаду, сыфілісу і маляры»—заўляе дырэктар Бразыльскага нацыянальнага дэпартаменту аховы здароўя Эліэзарыё Пенна. На сусьветным пастаўшчыку кавы — Бразыліі—крызіс адбіўся надзвычай руйнуюча, з прычыны скарочаных рынкаў збыту. Гэта спрыяло да таго, што зарплата цэлай сям'і рабочага на плянтацыях кавы дайшла да 8 руб. у месяц. На цукровых заводах, а таксама тэкстыльнай і абутковай прамысловасьці зарплата ў Бразыліі дасягае ад 24 да 48 капеек у дзень. Дзесяткі капіталістычных краёў уцягнуты ў крызіс. Няма ні адной капіталістычнай краіны ні ў Эўропе, ні ў Амэрыцы, ні ў якой-небудзь іншай частцы сьвету, дзе-б крызіс ужо не падтачыў важнейшыя галіны гаспадаркі і дзе-б у рэзультаце гэтага працоўныя масы не перажывалі вялізарных цяжкасьцяй. Такавы вынікі 1931 г. для краін капіталізму. Працоўным нашай краіны цяжка ўявіць сабе поўнай выразнасьцю тую цяжкую абстаноўку, у якой знаходзяцца зараз мільёны рабочых сем'яў у краінах капіталізму. Западна вялікая розьніца паміж тым, што мае месца зараз у капіталістычных краінах, і ўмовамі жыцьця працоўных у краіне Саветаў. Таблицамі лічбаў і статыстычнымі малюнкамі пельга ў належнай меры ахарактарызаваць становішча спраў у капіталістычных краінах для значнай часткі працоўных СССР, асабліва з моладзі, якая не адчула на сабе жудасных умоў жыцьця ў абстаноўцы выключнага эканамічнага крызісу. Для гэтага больш-падыдуць жывыя малюнкі быту, погляд пле паказаньне цяперашніх умоў жыцьця рабочых у краінах панавальня капіталу. У СССР у мінулым годзе посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва забясьпечылі далейшае паляпшэньне ва ўсёй народнай гаспадарцы. Тут, на аснове магутнага росту прадукцыйных сіл сацыялістычнай гаспадаркі, з году ў год паляпшаюцца і ўмовы жыцьця працоўных.

За апошнія тры гады, г. зн. за першыя гады выкананьня пяцігодкі мы мелі наступны прырост прадукцыі прамысловасьці (паводле супастаўленага, няпоўнага кола прамысловай прадукцыі): у 1929 годзе прырост прадукцыі раўняўся 3.296.000.000 руб., у 1930 годзе — 3.635.000.000 руб., у 1931 годзе — 4.139.000.000 руб. Калі-ж узяць поўныя даныя па прамысловай прадукцыі, дык прырост прамысловай прадукцыі за адзін 1931 год дасягае фактычна звыш 4.800.000.000 рублёў.

Вельмі паказальны даныя аб росьце заработку рабочай сям'і за гэтыя тры гады. Гэтыя даныя паказваюць, што з 89 руб. у пачатку 1929 году месячны

заработак рабочай сям'і ўзьняўся ў канцы 1931 году да 146 рублёў, г. зн. узрос на 64 проц. За адзін мінулы год зарплата рабочых у СССР павысілася ў сярэднім на 18 проц. Для рабочых чорнай мэталюргіі, горна-рудной і каменна-вугальнай прамысловасьці павышэньне зарплаты ў адным мінулым годзе дасягнула ад 25 да 36 проц.

Значна таксама была павышана зарплата работнікаў чыгуначнага і воднага транспарту, асабліва для вядучых груп (на 35-50 проц.). Нельга не адзначыць і таго, што з пачатку 1932 году зарплата настаўнікам і мэдработнікам павышана на 22-25 проц. у сярэднім. Для некаторых катэгорый гэтых работнікаў павышэньне дасягае 30 проц.

Для выніку 1931 году СССР мае, пэрэшце, вялізарнае значэньне факт вялізарнага росту актыўнасьці рабочых у сацыялістычным будаўніцтве. Аб гэтым сьведчаць даныя аб рабоце саўсаборніцтва і ўдарніцтва на фабрыках і заводах, а таксама ў саўгасах і калгасах. Да канца 1931 году армія ўдарнікаў у прамысловасьці дайшла да 3,5 млн. чалавек. Колькасьць ударных брыгад узрасла да 200.000.

Супастаўленьне выніку 1931 году ў капіталістычных краінах і Савецкім Саюзе гаворыць само за сябе. Эканамічнае становішча ў краінах капіталізму за гэты год значна пагоршылася. Тым самым былі парушаны многія і многія прадпасылкі аб пэрспэктывах, якія паляпшэньня, у разьвіцьці капіталістычных краін. Але асабліва важна, што выніку 1931 году нічога добрага не прадракаюць для капіталістычных краін і ў 1932 годзе. Ня толькі ня відаць ніякіх адзнак іх выхаду з крызісу, але, наадварот, ідзе далейшае паглыбленьне крызісу і далейшае пагоршэньне ўмоў жыцьця працоўных у гэтых краінах.

У сувязі з гэтым ня шкодзіць сёе-тое ўспомніць з фактаў учарайшняга дня, як па самай справе хутка разьбіліся ўсякія ілюзіі паслугачоў капіталу з лягеру сацыял-дэмакратыі паконт посьпехаў «арганізаванага капіталізму» Ад тэорыі аб «арганізаваным капіталізме», выдуманай лідэрамі II Інтэрнацыяналу, накшталт Гільфэрдынга, не засталося камня на камені. Затое, падладжаючыся пад рабочых, правадыры II Інтэрнацыяналу, накшталт «левага» О. Бауэра стараюцца адчайна да насьпяючых падзей, напрыклад, наступнымі фразамі: «глядзеце, капіталістычны сьвет хістаецца». «Набліжаецца гадзіна вялікіх рашэньняў» і інш. Як учора свае тэорыямі аб «арганізаваным капіталізме», так і цяпер сваімі «левымі» фразамі аб «капіталізме, які хістаецца», лідэры II Інтэрнацыяналу хочуць усыпіць рабочых, хочуць перашкодзіць пераходу рабочых да сапраўднай барацьбы з капіталізмам.

Між іншым, Бауэру не пагаварыць аб «капіталізме, які хістаецца», калі нават прыхаўны правадыры буржуазіі даходзяць да запу такога-ж роду. Нядаўна быў апублікаван ліст дырэктара ангельскага банку Монтэгю Нормана, старшыні францускага банку Моро. У гэтым лісьце гаворыцца наступнае: «Калі ня будуць прыняты рашучыя меры да яе адтаваньня, капіталістычная сыстэма загіне ва ўсім цывілізаваным сьвеце на працягу аднаго году. Я хацеў бы, каб мае прадпасылкі было запісана ў архівах, каб можна было спасылацца на яго ў будучым». Запішам — як быццам ад гэтага яму будзе лягчэй (сьмех).

У СССР, наадварот, справы ідуць да лепшага. Калі пачыліна ў фундаманце капіталізму ўсё больш разрастаецца, дык у краіне Саветаў 1931 год быў годам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялізму. Сацыялістычны сэктар заняў за гэты год пануючае становішча ня толькі ў горадзе, але і на вёсцы. Тым самым фундамант сацыялістычнага грамадзтва пакладзен моцна. Мы павінны, аднак, памятаць словы Леніна аб тым, што посьпехі не павінны нам кружыць галоў. Посьпехі сацыялізму ў СССР сапраўды вялікія, тым ня менш мы, бальшавікі, павінны памятаць выказанае Леніным у дзень яго 50-годзьдзя пажаданьне, «каб мы нікіх чынам не паставілі нашу партыю ў становішча партыі, якая зазналася». Ленінізм вучыць не супакойвацца на дасягненьнях, а ісьці наперад, і прытым з падвоенай клясавай пралетарскай пільнасьцю пабальшавіцку перамараючы шматлікія яшчэ праяўленьні супраціўленьня клясавага верага.

II. Пяцігодка за чатыры гады

Пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі ў СССР быў канчаткова прынят вясной 1929 г. Гэты год быў разам з тым першым годам выкананьня пяцігодкі. Рабочая клясэ з посьпехам спраўлялася з заданьнямі першага году пяцігодкі. Гэта выклікала новы прыліў энтузіязму ў рабочых масах. Заданьні другога году пяцігодкі выконваліся таксама з посьпехам. І ўжо ў той час, на другім годзе пяцігодкі, пачала складацца ўпэўненасьць у тым, што мы выканаем пяцігодку не за пяць, а за чатыры гады.

Мінулы год быў трэцім годам пяцігодкі. Ён даў новыя вялізарныя дасягненьні ў нашым гаспадарчым будаўніцтве.

1. Аб пяцігодцы ў прамысловасьці

Ужо ў 1931 годзе на радзе гэкін у прамысловасьці пяцігодка аказалася выкананай. Да ліку буйнейшых галін прамысловасьці, выканаўшых пяцігодку за 2 з пал.—3 гады, адносяцца нафтавая, электратэхнічная, трактарабудаўніцтва і агульнага машынабудаўніцтва. Ня будзе казываць паасобных прадпрыемстваў, якія выканалі сваю пяцігодку. Аб гэтым паведамлялася ўжо ў друку. Але нельга не адзначыць, што наш буйнейшы прамысловы цэнтр — Ленінград — таксама ў асноўным выканаў сваю пяцігодку пагэтых даных вышэйшае з таго, што ў пяцігадовым пляне ня ўлічвалася прадукцыя раду галін, якія толькі ў ходзе выкананьня пяцігодкі сталі ператварацца ў галіны буйной сацыялістычнай прамысловасьці.

На жаль, наша статыстыка спазьнілася з тым, каб у цяперашнім уліку прамысловай прадукцыі (а таксама капітальных укладаньняў) забясьпечыць поўнае асьвятленьне зьмен, якія адбыліся, і поўнае іх адлюстраваньне ў статыстычных паказальніках. Гэты недахоп статыстыкі павінен быць неадкладна зьнішчан.

Для гэтага апошняга (пятага) году пяцігодкі прамысловая прадукцыя была прадугледжана ў разьмеры 30.455 млн. руб. Вядома, далей, што ў 1931 годзе прамысловая прадукцыя (паводле ўказаных ужо далёка няпоўных даных) складзе 22.159.000.000 рублёў, г. зн. дасягне 73 проц. ад узроўню пятага году пяцігодкі па прамысловай прадукцыі. Значыць, нават пры гэтым няпоўным уліку ўзрастаючай прампрадукцыі (якая ня ўключае, напрыклад, раду галін шпарка ўзрастаючай харчовай індустрыі) для забясьпячэньня выкананьня пяцігодкі ў 1932 годзе неабходна было-б забясьпечыць у гэтым годзе прырост прадукцыі супроць мінулага году на 8.296.000.000 руб., г. зн. дабіцца па прамысловай прадукцыі прыросту ў 34,7 проц.

Між тым, запраектаваныя ў народна-гаспадарчым пляне 1932 году заданьні па прамысловай прадукцыі павінны даць прырост у 8.503.000.000 рублёў, г. зн. прырост на 36 проц. супроць мінулага году. Гэта азначае, што прадстаўленым Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту Саветаў народна-гаспадарчым плянам прадугледжваецца ня толькі выкананьне заданьняў пяцігодкі па прамысловай прадукцыі на пяты год пяцігодкі (прырост супроць 1931 г. на 34,7 проц.), але і перавыкананьне гэтых заданьняў — прырост супроць 1931 году на 36 проц. Гэта разам з тым дае неравнымерное даваеннага ўзроўню прамысловасьці амаль у 4 разы. Па лёгкай прамысловасьці заданьні 1932 году азначаюць некаторае недавыкананьне вытворчай праграмы пятага году пяцігодкі, але затое на цяжкай прамысловасьці гэтыя заданьні азначаюць значнае перавыкананьне вытворчай праграмы апошняга году пяцігодкі. Прыведзеныя тут няпоўныя даныя аб прамысловай прадукцыі адносяцца толькі да кола прамысловых галін, уключаных у плян (1926-27 году). У выніку гэтага ў гэтых лічбах ня ўлічана прадукцыя цэлага раду галін прамысловасьці, а іменна, ня ўлічана прадукцыя наступных галін: частка лесазагатовак, лясная, мукамольна-крупяная, частка плодагародная, масларобства, птушкаводная, кава-сурагатная, частка вінакурэнай і сьпіртна-гарэлачнай прамысловасьці і яшчэ некаторыя іншыя галіны. У рэзультаце, калі поўнасьцю ўлічыць прадукцыю прамысловасьці, дык для апошніх год пяцігодкі разьмеры гэтай прадукцыі значна павысяцца ў параўнаньні з прыведзенымі вышэй даным. Зробленыя ў апошні час палічкі ўсёй прамысловай прадукцыі акрэсьліваюць прампрадукцыю 1931 году ў 27,4 міль ярда рублёў, а адпаведныя даныя для 1932 году даюць 37,5 мільярда рублёў. Нават робячы за лік больш поўнага ўліку адпаведныя дабаўленьні да агульнай сумы валавой прадукцыі апошняга году, наводле пяцігадовага пляну, мы павінны зрабіць вывад, што фактычна праграма 1932 году дае за 4 гады значна большае перавыкананьне пяцігодкі па прамысловай прадукцыі чым гэта паказвае прыведзеная статыстыка з няпоўным ахопам прамысловых галін.

На лініі капітальнага будаўніцтва прамысловасьці мы прасоўваемся ўсё хутчэй у выкананьні заданьняў пяцігодкі. Капітальнае будаўніцтва прамысловасьці было намечана на ўсе 5 гадоў у разьмеры 13,5 млрд. рублёў. За тры гады сума капітальных укладаньняў па ўлічваным цяпер няпоўным коле галін прамысловасьці вылічваецца ў 12,3 млрд. руб. Гэта значыць, што ўжо за першыя тры гады сума капітальных работ складала велічыню, блізкую да сумы ўсіх укладаньняў, намечаных па пяцігодцы. За 4 гады сума капітальных работ па ўлічваным цяпер няпоўным коле прамысловасьці складзе 20,3 млрд. руб. Такім чынам, нават пры гэтым няпоўным уліку ўзрастаючых капітальных укладаньняў, уся пяцігодка выконваецца за 4 гады ў разьмеры 150 проц. Калі-ж узяць усю суму капітальных укладаньняў за першыя тры гады, а іменна 16 млрд. руб., і дадаць да яе ўсю суму капітальных работ 1932 г., а іменна 10,7 млрд. руб., дык злучнасьць укладаньняў за 4 гады дасягае 26,7 млрд. руб. Гэта значыць, што па капіталаўкладаньнях пяцігодка выконваецца за 4 гады з падваеньнем. У гэтым — зарука нашай канчатковай перамогі, зарука вялікай будучыні сацыялізму. З гэтым варта супаставіць той факт, што ў 1913 г. асноўны капітал усёй прамысловасьці царскай Расіі дасягаў усяго 4.460 млн. руб. Нават улічваючы ўмоўнасьць гэтага параўнаньня (у рублёх), нельга ня прызнаць, што тэмпы пяцігадовага капітальнага будаўніцтва ня могуць ісьці ні ў якое параўнаньне з ростам капіталных укладаньняў у дарэвалюцыйны час.

На ўсім агромадным [illegible]

роднай гаспадаркі капітальныя ўкладаньні за ўсю пяцігодку прадугледжваліся ў пяцігадовым пляне ў разьмеры 47 млрд. руб. У сувязі з пляном 1932 г. па капітальных укладаньнях народнай гаспадаркі ў цэлым сума ўкладаньняў за 4 гады будзе дасягаць звыш 54 млрд. руб. Такім чынам, па разьмерах капітальных укладаньняў у народную гаспадарку мы павінны перавыканаць пяцігодку на 16 проц.

ЗАЎВАГА: І тут трэба зрабіць агаворку аб значнай непаўнаце ўліку, на што ўжо паказвалася вышэй. Плян 1932 г., у адпаведнасьці з асноўнымі задачамі, згуртоўвае сілы па важнейшых галінах прамысловасьці — па чорнай мэталюргіі, апале (асабліва вугаль), машынабудаўніцтве і, у першую чаргу, машынабудаўніцтве для чыгуначнага транспарту.

Пачну з мэталюргіі. Тут мы маем асабліва буйнае недавыкананьне вытворчага заданьня за мінулы год. Гэта адбілася і на праграме 1932 г., якая, пры ўсім яе выключным росьце, не дае нават поўнага выкананьня пляну пяцігодкі. Вытворчая праграма па чорнай мэталюргіі паднімаецца з 5-ці млн. тон 1931 г. да 9 млн. тон у будучым годзе. Гэта патрабуе выключнай увагі да мэталюргічных заводаў. Між тым, вопыт мінулага году паказаў, і іменна па прыкладзе мэталюргіі асабліва востра паказаў, недахоп нашай увагі ў адносінах дзейнічаючых заводаў. І ў адносінах забясьпячэньня кадрамі, і асабліва ў адносінах тэхнічнага спабжэньня пярэдка мела месца здавальненьне перапавялічаных заявак новабудоўляў за кошт дзейных заводаў. З гэтым нельга ні ў якім выпадку мірыцца.

Падняцьце вытворчасьці па мэталюргічных заводах запраектавана ў такіх маштабах, што толькі намаганьнямі ўсёй партыі можна выканаць гэтыя заданьні. А заданьні гэтыя ня толькі павінны быць выкананы, але трэба дабіцца іх перавыкананьня.

На лініі капіталнага будаўніцтва мэталюргіі ў 1932 годзе таксама намечана вялізарная праграма. Укладаньні ў мэталюргію дасягаюць амаль 2 млрд. руб. Ніколі і ні ў адну галіну прамысловасьці ня ўкладвалася такіх сродкаў за адзін год. Мы намецілі пуск у гэтым годзе 24-х новых доменных печаў. Гэта даволі значнае заданьне. Мы думалі, што пуск новых доменных печаў перакрые згортваньне мэталюргіі ў іншых дзяржавах. Але, аказваецца, за імі ня ўгнацца. За 1931 г. толькі ў ПАЗШ затушылі (са студзеня па верасень месяц) 29 домен, Францыя — 24 домны, Англія — 21 домна і Германія—14 домен. Не ад добрага жыцьця тушацца дзесяткі домнаў у капіталістычных дзяржавах. Затое СССР ва што-б там ні стала забясьпечыць у 1932 г. пуск 24-х новых домнаў (воплескі).

Вытворчая праграма па вугалі на 1932 год намечана ў 90.000.000 тон. Маем на ўвазе максымальнае разгортваньне здабываньне вугалю ў Данецкім і Кузьнецкім басэйнах, а таксама і ў іншых раёнах, з якіх асабліва значэньне маюць Урал і Падмаскоўны раён. Апошні ў найкарацейшы тэрмін павінен зрабіцца асноўнай апалавай базай для Масквы і Маскоўскай вобласьці.

Пытаньням апалу (вугаль, нафта і інш.) у мінулым годзе прыходзілася аддаваць асабліва вялікую ўвагу. За здабычай вугалю ў Данбасе сачылі на ўсіх заводах і ва ўсіх кутках Савецкага Саюзу. Справа мэханізацыі здабычы вугалю пастаўлена была ў разрад буйнейшых гаспадарчых задач. І тым ня менш, нават прасоўваньне наперад у гэтай галіне далёка невыстарчальна. Так, каля адной трэцяй урубавых машын у Данбасе бязьдзейнічаюць. Продукцыйнасьць працы расьце недапушчальна марудна. Значыцца, у даным выпадку з аўладаньнем тэхнікай справа стаіць нездаральняча. Гэтымі днямі ў газэце «За индустриализацию» быў зьмешчан артыкул тав. І. Касіёра, які шмат папрацаваў у гэтым годзе ў Данбасе. Тав. Касіёр, справядліва завастраючы ўвагу на пытаньнях быту і арганізацыі працы, паказвае на тое, што мэханізацыі, якую «трэба паставіць у галаву вугла», не аддаецца належнай увагі і па шахце, і з боку тых, хто абслугоўвае шахту (тэхснабжэньнем і інш.). Ён адзначае, далей, што мэханізацыя пастаўкі і, асабліва, адкаткі адстае ад мэханізацыі адбойкі вугалю. Між тым, разгортваньне мэханізацыі магло-б, па яго думцы, скараціць колькасьць рабочых у вугальнай прамысловасьці Данбасу на 50 ці нават на 100 тыс. супроць меркаваных па пляне 400 тыс. да канца 1932 г. Тады-б, зразумела, і задача паляпшэньня быту рабочых у Данбасе ажыцьцяўлялася-б большым посьпехам, а без далейшых паляпшэньняў у гэтай галіне, а таксама ў арганізацыі працы (ліквідацыя абязьлічкі і ўраўніловкі) нельга забясьпечыць выкананьне намечанай вытворчай праграмы. У мінулым годзе Данбас высунуў некалькі выдатных работнікаў па мэханізацыі здабычы вугалю. Імёны гэтых таварышоў сталі вядомымі ўсёй краіне. Таварышоў Епіфанцава, Карташова, Касаурава, Лібхарда і Філімонава побач з іншымі выдатнымі работнікамі сацыялістычнай індустрыялізацыі ўзнагароджаных ордэнам Леніна, рабочыя Данбасу высунулі, як застрэльшчыкаў правядзеньня мэханізацыі [illegible]

будуць высунуты ў далейшым, трэба ўсямерна падтрымаць у правядзеньні новых мэтадаў, палягчаючых працу рабочых і паскараючых выкананьне вытворчых заданьняў на вугалі.

Пытаньне аб мэханізацыі мае актуальнейшае значэньне і для іншых галін прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і транспарту. Але трэба прызнаць, што наша прасоўваньне ў гэтай галіне ў радзе выпадкаў дзе недапушчальна марудна. Аб посьпехах мэханізацыі ў лясной прамысловасьці, на торфе, па пагрузачна-разгрузачных работах і г. д. трэба меркаваць па сапраўдных посьпехах у замене ручной сілы, па росьце прадукцыйнасьці працы, па выкананьні вытворчых праграм. Разгортваньне мэталюргіі, апалавай прамысловасьці, зававаленьне патрэб чыгуначнага транспарту і інш. патрабуюць далейшага паскоранага росту нашай машынабудаўнічай прамысловасьці.

Машынабудаўніцтва ў СССР за першыя тры гады пяцігодкі зрабіла вялікія посьпехі. Ні адна галіна прамысловасьці не пасунулася наперад так далёка, як машынабудаўніцтва. Даволі ўказаць на такія галіны, як трактарабудаўніцтва, магутныя турбагенэратары і турбіны, блюмінгі, урубавыя машыны, судновыя дызэлі, магутныя радыёстанцыі, сьвідравальныя варштаты і г. д., каб падкрэсьліць наша дасягненьні ў гэтай галіне. Гэтыя посьпехі адлюстроўваюць важнейшыя дасягненьні рабочай клясы СССР у аўладаньні тэхнікай. У сувязі з гэтым асабліва паказальны прыклад з трактарнымі заводамі ў Сталінградзе і Харкаве. Як вядома, сталінградзкі трактарны завод у першыя месяцы з цяжкасьцю наладжваў сваю справу. Патрабавалася ня раз умяшаньне ВСНГ. Сталінградзкаму заводу аказвала дапамогу ўся партыя. Справа, пэрэшце, была пастаўлена на ногі, і ў апошнія некалькі месяцаў сталінградзкі завод добра паладзіў выпуск звыш 100-110 трактараў у дзень.

Вопыт сталінградзкага заводу ў вялікай меры быў выкарыстан харкаўскім трактарным заводам. Апошні быў ня толькі пабудован за вельмі кароткі тэрмін — за 15 месяцаў, але і даў прыклад спраўды насьпяховага аўладаньня тэхнікай трактарабудаўніцтва. Толькі на шесты месяц сталінградзкі завод даў 356 трактараў. Ужо па другі месяц харкаўскі завод даў 386 трактараў. Гэта даказвае, што ўроки Сталінграду ня прайшлі для нас дарма, што аўладаньне тэхнікай трактарабудаўніцтва ідзе з посьпехам.

Барацьба за аўладаньне тэхнікай мае вялізарнае значэньне для выкананьня ўсяго пяцігадовага пляну. Ад сапраўдных посьпехаў у гэтай справе ва многім залежыць справа сацыялістычнага будаўніцтва. Да апошняга часу мы знаходзіліся ў вялікай залежнасьці ў гэтай справе ад заграніцы. Пярэдка гэта залежнасьць давала сябе адчуваць нават па другарадных участках гаспадарчай работы. Але за апошнія гады становішча пачало прыкметна зьмяняцца. Цяпер мы ўжо поўнасьцю вызваліліся ад тэхнічнай залежнасьці ў адносінах да капіталістычных краін па радзе важнейшых вытворчасьцяй. Прыклады з трактарамі і блюмінгамі ясна паказалі, наколькі насьпяхова мы пачалі прасоўвацца ў аўладаньні тэхнікай. Асабліва нам зараз неабходна аўладаньне тэхнікай вырабу якасных сталяй. Аднак, усё гаворыць за тое, што ніякіх непераможных перашкод ва ўсёй гэтай справе для нашай прамысловасьці цяпер ня існуе. Тры гады пяцігодкі прайшлі недарма. Неабходна, каб у аўладаньні тэхнікай 1932 год быў далейшым буйным крокам наперад ва ўсёй нашай рабоце і вучобе нашай моладзі.

Мне прышлося падрабязна спыніцца на выкананьні пяцігодкі за чатыры гады на лініі прамысловасьці. Гэта вынікае з таго, што індустрыі належыць вядучая роля ў народнай гаспадарцы. Усе галіны народнай гаспадаркі апіраюцца ў сваім уздыме на работу прамысловасьці, на выраб мэталю і апалу, на машыны, якія робяцца індустрыяй, варштаты і інструманты.

2. Пяцігодка сельскай гаспадаркі

Перабудова ўсёй сельскай гаспадаркі была-б немагчымай без пераробкі на тэхнічнай базы, без забясьпячэньня с.-г. вытворчасьці трактарамі, камбайнамі, пасеўнымі і ўборачнымі машынамі. У гэтых адносінах за тры гады пяцігодкі мы ажыцьцявілі спраўдны пераварот у саным с.-г. машынабудаўніцтве. Ад вырабу старых с.-г. машын, прыстасаваных да дробнай адпаасобнай гаспадаркі, с.-г. машынабудаўніцтва зрабіла рашучы крок наперад і прытым на такую высокую ступень, якая вышэй адпаведнага сярэдняга ўзроўню любой капіталістычнай краіны. У 1932 годзе сельская гаспадарка павінна атрымаць зноў звыш млн. сіл (умоўных) ад новых трактараў, цалкам паступаючых з нашых уласных трактарных заводаў («Красный путиловец», сталінградзкі, харкаўскі). Апрача таго, павінна быць выпушчана с.-г. машын на 900 млн. руб., прычым галоўным чынам асабліва нам патрэбны ўборачныя машыны для збожжавых культур, бавоўны, буракоў, ільну, бульбы і інш.

(Працяг на 2-й старонцы).

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Аб народна-гаспадарчым пляне на 1932 год

Даклад старшыні СНК СССР тав. МОЛАТАВА на другой сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР

Асаблівае і пры тым выдатнае месца ў перабудове сельскай гаспадаркі належыць машына-трактарным станцыям. За мінулыя тры гады пяцігодкі МТС сталі самай папулярнай і патрэбнейшай калгасам арганізацыяй.

Толькі з сярэдзіны 1929 г. пачынаньне тав. Маркевіча у Шэўчанкаўскім саўгасе на Украіне начало шпарка пашырацца па іншых раёнах і дзякуючы стварэньню ўсесаюзнага Трактарацэнтру мы маем да канца 3-га году пяцігодкі 1.400 МТС. На 1932 г. намечана арганізацыя новых 1.700 МТС. Такім чынам, да канца чацьвертага году ў нас будзе 3.100 МТС. Пры падлічэньні, прыкладам, 2,5 тыс. раёнаў СССР, гэтыя 3.100 МТС павінны забясьпечыць амаль ва ўсіх раёнах Саветскага Саюзу ахоп машына-трактарнымі станцыямі асноўных вучасткаў калгаснай сельскай гаспадаркі.

Вядзіарная перавага машына-трактарных станцый, якія маюць моцную тэхнічную базу на месцах і працуюць па адзіным пляне і над агульным кіраўніцтвам свайго ўсесаюзнага цэнтру, шмат у чым ужо выявілася. Пры многіх ашчэ недахопах на практыцы, МТС адыгрываюць выдатную ролю ва ўзьнікненьні с.-г. вытворчасьці. Наперадзе перад МТС стаяць яшчэ больш важныя задачы па ўдзеле ў будаўніцтве сацыялізму.

Вопыт МТС пачынае пашырацца і па новых галіны гаспадаркі.

Так, у мінулым годзе ўжо створана каля 200 машына-сенакосных станцый. Вядзіарнае станоўчае значэньне арганізацыі гэтага тыпу ўжо даказана. На вопыце МТС прызнана неабходным арганізаваць машына-лясныя станцыі для лесараспрацовак. У бліжэйшы час прыступяць да арганізацыі маторна-рыбалоўных станцый на рыбных промыслах. Пры ўсіх асаблівасьцях гэтых галін гаспадаркі вопыт МТС у збожжавай гаспадарцы па вялікі бліск шырока выкарыстан, вядома, з улікам асаблівасьцяй раёну і галіны вытворчасьці.

Увязка праз МТС дзяржаўных арганізацый з калгаснымі-арганізацыямі і стварэньне на гэтай аснове і для поўных мэт асобных арганізацый тыпу МТС мае першачарговае значэньне з пункту погляду паскарэньня і моцы пераходу масавай дробнай гаспадаркі на рэйкі буйной сацыялістычнай гаспадаркі.

Нарэшце, добрыя результаты даў вопыт стварэньня пры падтрыманьні дзяржавы малочна-таварных калгасных ферм. Гэта справа патрабуе далейшага падтрыманьня і разам з тым яшчэ больш актыўных адносін саміх калгасаў.

Як выконваецца лёзунг «Пяцігодка — за чатыры гады» — на лініі сельскай гаспадаркі? Вядома, што ў адносінах калектывізацыі сельскай гаспадаркі мы ўжо даўно перайшлі праз заданьні апошняга году пяцігодкі. Паводле пяцігодовага пляну па 5 год належала калектывізаваць 20 проц. сялянскіх гаспадарак. Мы ўжо да канца трэцяга году пяцігодкі маем звыш 60 проц. калектывізаваных гаспадарак. Такім чынам, заданьне ўсёй пяцігодкі ўжо на трэцім годзе па выкананьні перавышана больш, чым у тры разы, а ў рашаючых збожжавых раёнах калектывізацыя ў асноўным ужо скончана. Няма ніякіх сумненьняў у тым, што 1932 год будзе годам завяршэньня ў асноўным калектывізацыі на СССР у цэлым.

У адзаведнасьці з гэтым Цэнтральны Камітэт нашай партыі ўказаў на неабходнасьць сканцэнтраваньня ўвагі на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, на задачах арганізацыі працы ў арцелях і камунах. Нельга забываць таго, што выключна хуткі рост калектывізацыі разам з тым азначае, што мільёны новых калгаснікаў ва многіх адносінах яшчэ не змаглі ажыць прывычак і поглядаў дробных уласьнікаў. Таму сацыялістычна-выхаваўчая работа ў калгасных масах і рашэньні за ўсё забясьпечэньне першачарговага выкананьня з боку калгасаў абавязацельстваў перад дзяржавай, асабліва па здачы таварнай прадукцыі, вынікаюць цэнтральнай задачай бальшавікоў у вёсцы.

Па лініі будаўніцтва саўгасаў мы таксама перавыканалі заданьне ўсёй пяцігодкі.

Сетка збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў, а таксама саўгасаў на радзе тэхнічных культур разгарнулася з выключнай хуткасьцю. Пры гэтым саўгасы адыгралі вялізарную ролю для ўсёй справы калектывізацыі ў нашай краіне, як першыя арганізатары буйной сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Тым з большай настойлівасьцю неабходна ўзяцца за ліквідацыю буйных недахопаў, з асаблівай неспасьцю выкрытых у апошні час па саўгасах Зернааб'яднаньня і Цукратрэсту. Разам з тым неабходна даць рашучы адпор апартуністычным хістаньням у пытаньні аб падтрыманьні саўгасаў.

Далей, як выконваецца пяцігодка на павялічэньні пасеўнай плошчы? Даным пяцігадовага пляну па расьпіхненьні да канца пяцігодкі каля 41 млн. га пасеваў выкананы за першыя 3 гады з посьпехам. Мы ўжо дасягнулі па пасеўных плошчах каля 37,5 млн. га. План 1932 г. даводзіць пасеўную плошчу да 141 млн. га, гэта значыць поўнасьцю забясьпечвае выкананьне заданьня пяцігодкі за 4 гады.

Пры гэтым па збожжавых культурах заданьне пяцігодкі будзе ў 1932 годзе некалькі недавыканана (95 проц.). Ня гледзячы на гэта, збожжавая праблема, дзякуючы посьпехам калгаснага будаўніцтва, у асноўным ужо вырашана ў нашай краіне. З другога-ж боку ўжо на чацьвертым годзе пяцігодкі заданьне на пасеўных плошчах тэхнічных культур будзе значна перавыкананае (133 проц.), а гэта азначае, што ў сэнсе падвядзеньня сырцовай базы пад нашу прамысловасьць мы зробім значна большыя посьпехі ўжо ў чацьвертым годзе пяцігодкі, чым працугледжвалася ўсім пяцігадовым планам. Трэба дадаць да гэтага, што цяпер цэнтр цяжару нашай работы ляжыць не ў галіне пашырэньня пасеўнай плошчы, а ў барацьбе за ўраджай, у падняцьці ўраджайнасьці, у арганізацыі ўборкі.

Калі збожжавая праблема намі ў асноўным вырашана, калі разам з тым у адносінах тэхнічных культур мы ўжо дабіліся вялізарнага зруху і з кожным годам прасоўваемся наперад усё хутчэй, дык значна адсталым участкам застаецца жывёлагадоўчая гаспадарка. На задачах узьдыму жывёлагадоўлі мы цяпер павінны сканцэнтраваць асаблівыя намаганьні. Паколькі гэта цяжэйшым чынам зьвязана са стварэньнем моцнай кармовай базы і паколькі нам неабходна далейшае паскарэньне ўздыму тэхнічных культур, пастолькі пытаньне аб павялічэньні збожжавай прадукцыі СССР застаецца актуальнейшым пытаньнем усёй нашай работы.

Больш таго. Напатыкаўшая нас у гэтым годзе засуха ў радзе буйнейшых с.-г. раёнаў, а іменна ў раёнах Сярэдняй і Ніжняй Волгі, Уралу, Казакстану і Заходняй Сібіры, напамінае нам і аб справе барацьбы з засухай. Калі 10 год таму назад, калі засуха прыняла да простага голаду мільёны сялян поўдню і ўсходу, мы яшчэ былі слабы для разгорнутай барацьбы з гэтым няшчасьцем, дык цяпер прыйшоў час па-бальшавіцку паставіць гэту задачу ў парадак дня савецкай улады.

Нарэшце, аб капітальных работах на сельскай гаспадарцы. Размер капітальных работ па сельскай гаспадарцы ў гэтым годзе павышаецца з 3.600 млн. руб. да 4.360 млн. руб. Гэтым планам забясьпечваецца такі рост капітальных укладаньняў па сельскай гаспадарцы, што параўнальна з намячэньнямі ўсёй пяцігодкі мы за 4 гады будзем мець ужо значнае іх перавыкананьне (156 проц.).

Са сказанага відаць, што як па лініі прамысловасьці, так і па лініі сельскай гаспадаркі пралетарыят СССР ня толькі выконвае, але і перавыконвае заданьне пяцігодкі, што народна-гаспадарчы план 1932 г. зьяўляецца ўвасабленьнем выкананьня пяцігодкі не за пяць, а за 4 гады.

3. Пяцігодка транспарту

Некалькі адстае выкананьне пяцігодкі па транспарце. Тут за першыя тры гады пяцігодкі ёсьць недавыкананьне раду заданьняў.

У мінулым годзе ўся партыя вяла барацьбу за зьнішчэньне выкрытых па транспарце буйнейшых недахопаў, асабліва недахопаў у арганізацыі працы — абязьлічка паравозаў і вагонаў, а таксама ўраўнілаўка ў заработнай плаце. Побач з гэтым неабходна значнае ўзмацненьне тэхнічнай базы і правядзеньне значных работ па рэканструкцыі нашага транспарту, асабліва чыгуначнага транспарту.

У 1932 годзе намячаецца значна шырэйшы размах рэканструкцыйных работ. Побач з увядзеньнем магутных паравозаў, якое пачынаецца ў гэтым годзе, вялікагрузных вагонаў, а таксама электравозаў, цепляво́заў і аўтасцэнкі — вялікае значэньне для ўзьнікненьня транспарту будзе мець правядзеньне тых, як часам гавораць «дробных», работ, ад якіх залежыць неадкладнае паляпшэньне работы чыгуначнага транспарту на радзе важнейшых вучасткаў.

На капітальнае будаўніцтва па чыгуначным, водным, дарожным і паветраным транспарце на 1932 год адпускаецца 3.330 млн. руб. Пры гэтым па чыгуначным транспарце работы канцэнтруюцца на разьвіцьці ліній Масква — Донбас, выхадаў з Донбасу і лініі Масква — Магнітагорск — Кузьнецк.

4. Пяцігодка па працы і быце працоўных

У становішчы працоўных мас СССР мы будзем мець значна большыя дасягненьні за 4 гады, чым гэта прадугледжвалася ўсёй пяцігодкай. Перш за ўсё спынюся на агульным росьце ліку занятых рабочых і служачых у народнай гаспадарцы. На пяты год пяцігодкі лік рабочых і служачых намячаўся ў 15,8 млн., але ўжо да канца мінулага году мы мелі на 3 мільёны больш рабочых і служачых, лік якіх дасягнуў 18,7 мільёна. Кантрольныя лічбы 1932 году прадугледжваецца далейшы рост ліку рабочых і служачых да 21 мільёна, што азначае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады ў размеры каля 133 проц. У самой прамысловасьці за апошні год пяцігодкі намячалася 4 мільёны рабочых; між тым, ужо на канца трэцяга году пяцігодкі мы мелі 5,4 мільёна. У чацьвертым годзе пяцігодкі гэта лічба дасягае 6,5 мільёна. Значыць, у адносінах непасрэдна індустрыяльных кадраў мы выкочваем пяцігодку на 52 проц. Гэта азначае, што наймацнейшая сацыяльная аснова СССР — рабочая кляса — шпарка расьце, з кожным годам павышаючы ўдзельную вагу рабочай клясы ва ўсім жыцьці нашай краіны.

Для характарыстыкі становішча, якое паляпшаецца, і ўмоў жыцьця рабочых і служачых у СССР спынюся толькі на трох момантах: на заработнай плаце, сацыяльным страхаваньні і рабочым дні на прадпрыемствах. Па ўсіх гэтых паказальніках мы маем значнае перавыкананьне заданьняў пяцігодкі.

На апошні год пяцігодкі ўвесь фонд заработнай платы акрэсьліўся ў 15,7 мільярдаў рублёў. Фактычна ўжо ў мінулым годзе гэты фонд дасягнуў 21,1 мільярда. Плянам 1932 году фонд заработнай платы ўзьнімаецца да 26,8 мярд. руб. Значыць, пяцігодка па фондзе заработкай платы выконваецца за чатыры гады ў разьмеры 171 проц. Лічбы гавораць самі за сябе.

Бюджэт сацыяльнага страхаваньня на апошні год пяцігодкі намячаўся ў 1.950 млн. руб. Фактычна ўжо ў мінулым годзе ён дасягнуў 2.500 млн. руб., г. зн. мы ўжо на трэцім годзе пяцігодкі значна перавыканалі пяцігодку па сацыяльным страхаваньні. На наступны год бюджэт сацыяльнага страхаваньня дасягае 3.940 млн. руб., г. зн. чацьверты год пяцігодкі дае амаль падвоенае супроць апошняга году пяцігадовым пляне.

Пяцігадовым плянам прадугледжвалася правядзеньне 7-гадзіннага рабочага дня ў апошнім годзе пяцігодкі. На справе мы ідзем значна шпарэй намячэньняў пяцігодкі і ўжо на чацьвертым годзе пяцігодкі заканчваецца правядзеньне 7-гадзіннага рабочага дня ва ўсёй прамысловасьці.

Нарэшце, аб жыльёва-камунальнай гаспадарцы. У мінулым годзе ў гэтай справе пачаўся рашучы зрух, перш за ўсё ў сталіцы СССР — у Маскве. Як вядома, побач з Масквой у наступным годзе пачынаюцца вялікія работы на жыльёва - камунальным будаўніцтве ў Ленінградзе, а таксама ў некаторых іншых прамысловых раёнах. Значыць, у паляпшэньні бытавых умоў жыцьця працоўных гэты пералом у камунальнай справе будзе мець буйнейшае значэньне. Нашай задачай зьяўляецца ажыцьцяўленьне на справе намечанай праграмы работ і падрыхтаваньне шырокага разгортваньня ўсёй жыльёва-камунальнай справы ў СССР. Няма неабходнасьці даказваць, што ў вёсцы рост матар'яльнага дабрабыту працоўных сялян ідзе цяпер нябывалым тэмпам. Калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва як клясы адкрылі перад усёй масай беднякоў і сераднякоў зусім новыя магчымасьці ўпярэдзе ў сусьветнай гісторыі, якія выводзяць асноўныя масы вёскі з галечы і вясковай цемры. Тым самым пачынаецца ажыцьцяўленьне зьнішчэньня процілегласьцяй паміж горадам і вёскай.

5. Аб агульных выніках і ворагах пяцігодкі

У выніку вялізарнага гаспадарчага ўздыму мы маем шпаркі рост усяго народнага даходу ў СССР. Карэннае адрозьненьне краіны сацыялістычнага будаўніцтва ад усяго капіталістычнага свету палягчаецца тым фактам, што пры надзвычайным паданьні народнага даходу ў капіталістычных краінах у сувязі з крызісам, вялізарны ўздым народнага даходу ў СССР знаходзіць свой адбітак у дасягненьні на 4-м годзе пяцігодкі ста процантаў таго ўзроўню, які намячаўся для апошняга году пяцігодкі, а іменна: народны даход у СССР у 1932 г. павінен перавысіць 49 млрд. руб. Гэта будзе азначаць разам з тым, што ўдзельная вага сацыялістычнага сэктару ў народным даходзе перавысіць 90 проц. супроць 71 проц. у пяцігадовым пляне.

Застаецца сказаць два словы аб дзяржаўным бюджэце. Сэсія ЦВК заслухае спецыяльны даклад па гэтым пытаньні, таму мне прыдзецца сказаць аб гэтым толькі два словы. Пяцігодка прадугледжвала, што сума дзяржбюджэту ў СССР за ўсе пяць год складзе 53,8 млрд. руб. Фактычна-ж ужо за тры гады пяцігодкі сума дзяржбюджэту складае звыш 48 млрд. руб. Калі да гэтага дадаць дзяржбюджэт 1932 г., а іменна 27,4 млрд. руб. плюс 3,1 млрд. руб. эксплёатацыйных выдаткаў па транспарце (што пяцігадовым плянам уключалася ў дзяржбюджэт), дык у адносінах дзяржбюджэту мы ўжо за 4 гады выканаем заданьне пяцігодкі на 146 проц. (78,6 млрд. руб. за 4 гады супроць 58,8 млрд. руб., прадугледжаных пяцігодкай на ўсе пяць год).

Такавы бясспрэчныя факты. Няма такой сілы, якая магла-б выкрасьліць гэтыя факты з гісторыі сацыялізму, з гісторыі міжнароднага пралетарыяту.

Есьць, аднак, Каўцкія, якія думаюць наадварот. У мінулым годзе Каўцкі змайстраваў цэлую кніжку — «Бальшавізм у тупіку». Цяпер ён працягвае герачную абарону гэтай «працы». Даволі прывесьці пару вытрымак з апошніх літаратурных практыкаваньняў Каўцкага, каб на іх пазрабяка ня спыняцца. Вось, напрыклад, што ён піша аб нашай пяцігодцы:

«Удача пяцігадовага пляну азначае на першы час проста значнае паляпшэньне матар'яльных прадукцыйных сіл Расіі, нешта накшталт таго, як рацыяналізацыя на працягу апошняга дзесяцігодзьдзя ў капіталістычным сьвеце».

Прызнаюча, трэба мець некаторую «смагу», каб параўнаць «удачу пяцігадовага пляну ў СССР з правядзеньнем прыгнятальнай рацыяналізацыі ў капіталістычных прадпрыемствах». Але Каўцкі на гэтым ня спыняецца, ён піша:

«Расійскі пралетарыят, пачынаючы з 1918 г., з году ў год усё глыбей спускаўся з тэй вышыні, якое ён дасягнуў. Ён не набліжаецца да сацыялізму, а ўсё больш адыходзіць ад яго».

Да больш галобных рэчаў дагаварвацца нельга. На прыкладзе Каўцкага відаць, што нават заняткі тэорыяй, прыналежа на старасьці год, не зьяўляюцца гарантыяй ад ганьбы патупеньня і палітычнай нізасьці. Недарма вядомы амэрыканскі пісьменнік Эптон Сінклер наконт кніжкі Каўцкага «Бальшавізм у тупіку» заявіў у вядомым артыкуле: «Я называю гэту кнігу ўніжэньнем для сацыялістычнага руху Германіі і пагрозай для ўсяго сацыялістычнага руху ў сьвеце».

Але Каўцкі ўсё цьвердзіць зады і паўтарае контр-рэвалюцыйныя выпады выгнаных з СССР меншавікоў. У сваю чаргу апошнія ня ідуць далей контр-рэвалюцыйнай мудрасьці, якая заключаецца ў тым, каб абвяшчаць будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне... дзяржаўным капіталізмам.

Добры, аднак, капіталізм, хаця-бы і дзяржаўны, без капіталістаў. Паўрадці адзін капіталіст, не гаворачы ўжо аб рабочых, паверыць таму, што ў якой-небудзь краіне можа існаваць дзяржаўны капіталізм, прычым буржуазія і памешчыкі сумесна з меншавікамі знаходзяцца ў выгнаньні. Меншавікі, тым ня менш, не саромяцца гаварыць аб дзяржкапіталізьме ў СССР, ня гледзячы на магутны рост сацыялістычнага спаборніцтва ў мільённых масах рабочай клясы, ня гледзячы на калектывізацыю мільёнаў сялянскіх гаспадарак, ня гледзячы на правядзеньне ліквідацыі кулацтва як клясы. Ці не зьяўляецца на самой справе лепшым пацьвярджэньнем дзяржкапіталізму ў СССР ажыцьцяўленьне савецкай уладай 7-гадзіннага рабочага дня на фабрыках і заводах? Не для абвяржэньня злобнай, але бясьсільнай балбатні аб дзяржкапіталізьме ў СССР, прыходзіцца тут гаварыць аб гэтым, а па іншых матывах.

Калі і прыходзіцца па гэтым слыняцца, калі і прыходзіцца адпачаць контр-рэвалюцыйныя выпады Каўцкага, дык толькі таму, што ўсе гэтыя паны выконваюць заказ ворагаў савецкай улады, выконваюць заказ ворагаў усёй рабочай клясы. А гэты заказ заключаецца ў дыскрэдытаваньні справы сацыялізму, у падрыве даверя чужаземных рабочых да савецкай рэспублікі. Усё гэта трэба імпэрыялістычнай буржуазіі для таго, каб падрыхтоўваць глебу для нападу на СССР, для ваеннай інтэрвэнцыі супроць сацыялістычнай рэспублікі.

Што гэта іменна так, можна пераканацца хаця-б на аснове тэй-жа кніжкі Каўцкага «Бальшавізм у тупіку». Тут празрыстыя заклікі да інтэрвэнцыі Каўцкі выказвае ў наступных словах:

«Перамога дэмакратыі (чытай: буржуазнай контр-рэвалюцыі. В. М.) у Расіі ня толькі адкрые сусьветнай прамысловасьці расійскі рынак, яна будзе ў надзвычайнай ступені спрыяць хуткаму пашырэньню гэтага рынку... Гэтым кладзецца пачатак працэсу, які, нарэшце, можа прывесьці да перамаганьня жудаснага крызісу, які ў сучасны момант «тяготеет» над усімі сучаснымі прамысловымі краінамі... На жаль, гэты рынак застаецца без усякага значэньня да таго часу, пакуль пануе бальшавізм».

Сэнс гэтай заявы Каўцкага зусім ясны. Каўцкі гатоў рэшткі сваіх сіл аддаць справе зьвяржэньня савецкай улады, каб замежны капітал мог у нашай краіне «свабодна» распарадзіцца новым рынкам і паставіць працоўных пад сваё ярмо. Але як-бы ні стараліся паны Каўцкія і ім падобныя паслугачы капіталізму, гэтаму ня бываць.

За нас гаворыць жыцьцё, справа, факты. Гэтыя факты — супроць капіталізму і разам з тым на карысьць сацыялізму. Тым з большай энэргіяй бальшавікі і разам з імі ўся маса працоўных будуць ажыцьцяўляць сваю пяцігодку, будуць будаваць сацыялізм. Для перамогі нашай справы пераходна разам з тым няўхільная барацьба з апартунізмам, у якое-б адзеньне ён не апранаўся. У адказ на апартуністычныя хістаньні, у адказ на апартуністычныя сумненьні ў рэалізацыі пастаўленых заданьняў на 1932 год, мы павінны ўзмацніць нашу работу і так не перабудаваць, каб на справе забясьпечыць сканчэньне пяцігодкі за чатыры гады. Мы будзем пры гэтым кіравацца тым, што гаварыў тав. Сталін аб рэальнасьці гаспадарчых заданьняў, прынятых нашай партыяй. Мне застаецца толькі паўтарыць гэтыя словы:

«Рэальнасьць нашага вытворчага пляну — гэта мільёны працоўных, якія творацъ новае жыцьцё. Рэальнасьць нашай праграмы — гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасьць працаваць па-новаму, наша рашымасьць выканаць план. Ці ёсьць у нас яна, гэта самая рашымасьць? Так, ёсьць. Значыцца, наша вытворчая праграма можа і павінна быць ажыцьцёўлена».

Гэтыя словы былі сказаны з повану вытворчага пляну 1931 г. З тым большай падставай яны павінны былі быць аднесены да праграмы 1932 г., асабліва палітычнае значэньне якой падкрэсьліваецца тым, што гэта праграма зьяўляецца праграмай сканчэньня пяцігодкі за чатыры гады.

У нас ёсьць усе асноўныя прадпасылкі для выкананьня гэтай праграмы. Ці ёсьць у нас у рабочай клясы і ва кіраўніцтве рашымасьць для выкананьня гэтай вялікай праграмы? Так, ёсьць. Мы прасякнуты рашымасьцю для яе выкананьня і мы яе выканаем (аплёдысмэнты).

III. Задачы моманту

Што трэба рабіць, каб ажыцьцявіць задачы 1932 г., каб завяршыць пяцігодку за чатыры гады?

Можна коратка адказаць на гэта пытаньне — узьняць прадукцыйнасьць працы на нашых фабрыках і заводах, у капальнях і на чыгунках, у саўгасах і калгасах. Ленін многа раз указваў на тое, што прадукцыйнасьць працы ў канчатковым выніку вырашае пытаньне аб перамозе новага грамадзкага ладу. Аб гэтым у даны момант прыходзіцца асабліва напоміць з прычыны ня спрыяльных у гэтых адносінах вынікаў мінулага году.

У 1931 г. прадукцыйнасьць працы ў прамысловасьці ўзьнялася на 6,6 проц. А гэта зусім невыстарчальна і далёка адстае ад прынятай праграмы. У выніку ва многіх выпадках мы ня толькі ня маем устаноўленага зьніжэньня сабекошту, але маем, наадварот, рост сабекошту ў вытворчасьці і ў будаўніцтве. З такім становішчам нельга мірыцца. У 1932 г. мы павінны разгарнуць па-сапраўднаму барацьбу за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы ў нашай прамысловасьці, у сельскай гаспадарцы і на транспарце. Тым болей, што намі ўсё робіцца для таго, каб не дапусьціць паўтарэньня фактаў мінулага году на транспарце, якія сарвалі ў значнай меры дасягненьні ў рабоце прамысловасьці. Усё гэта патрабуе разгорнутай барацьбы з радам буйнейшых нашых недахопаў у справе арганізацыі працы і кіраваньня.

У сувязі з гэтым, трэба спыніцца на наступных асноўных задачах моманту: а) пытаньні арганізацыі працы ў прамысловасьці, у саўгасах і на транспарце; б) пытаньні арганізацыі працы ў калгасах; в) разгортваньне таваразвароту; г) правядзеньне гаспадарчага разрахунку і д) праверка выкананьня.

а) Пытаньні арганізацыі працы. Гэтыя пытаньні ў мінулым годзе ўжо былі пастаўлены партыяй з усёй вострасьцю і сапраўды зьяўляюцца асноўнымі пытаньнямі работы нашых гаспадарчых органаў. Сюды адносіцца перш за ўсё барацьба з абязьлічкай у адносінах да машын і мэханізмаў і барацьба з ураўнілаўкай у зарплаце, а таксама пераход ад самацёку да арганізаванага набору рабсілы.

З найбольшай яркасьцю вынікі абязьлічкі выявіліся на чыгуначным транспарце.

Ліквідацыя абязьлічкі паравозаў адразу-ж станоўча адбілася на ўсёй паравозной гаспадарцы НКПЗ. Пасьля ліквідацыі абязьлічкі зьнізіўся процант хворых паравозаў. Значна зьнізілася нсаваньне паравозаў у дарозе, зьменшыліся выпадкі ненадачы паравозаў пад цягнікі і г. д. Пераход ад абязьлічкі да спаранай язды на паравозах і зьвязанае з гэтым устанаўленьне выразнай адказнасьці машыніста за работу паравоза даготуль ня ўсюды ў належнай ступені правядзены на чыгуначным транспарце. А гэта павінна быць даведзена да канца.

Ня толькі ў НКПЗ, але і ў іншых гаспадарчых органах абязьлічка і, значыцца, адсутнасьць адказнасьці за машыны, за варштаты, за інструманты, за выкананьне пэўных вытворчых заданьняў сустракаюцца на кожным кроку. Абязьлічка ўзмацнілася асабліва ў тых выпадках, дзе ў мінулым годзе няправільна падышлі да правядзеньня бесьперапыннага вытворчага тыдню. Усё гэта цяпер зьяўляецца агульнавядомым і таму барацьба з абязьлічкай значна палегчана. Трэба толькі па-сапраўднаму ўзяцца за правядзеньне прынятых рашэньняў.

З другога боку, буйнейшым недахопам у гаспадарчай рабоце зьяўляецца паляўнасьць ураўнілаўк ў зарплаце рабочых і тэхнічнага персаналу. Націск дробна-буржуазных элемэнтаў у гэтым выпадку заўсёды быў і яшчэ застаецца даволі моцным. Ён вядзе да ўвядзеньня заціканасьці такіх невыстарчальных у нас кваліфікаваных кадраў у посьпехах вытворчасьці. Таму барацьба з ураўнілаўкай, а таксама правядзеньне зьдзельчыны ў аплаце працы зьяўляюцца самымі падзейнымі пытаньнямі дня. Без ліквідацыі ўраўнілаўкі і, значыцца, забясьпячэньня належнай і больш высокай аплаты працы кваліфікаваных рабочых і тэхнічных сіл і адпаведнага асобнага вылучэньня ў гаспадарчым будаўніцтве паасобных важнейшых галін прамысловасьці, нельга ўзьняць справу арганізацыі працы ў нашых прадпрыемствах, нельга ліквідаваць цякучасьць рабочых кадраў, нельга па-сапраўднаму ўзьняць прадукцыйнасьць працы ў прамысловасьці і іншых галін гаспадаркі.

І так, пытаньні арганізацыі працы і, перш за ўсё, пытаньні барацьбы з абязьлічкай і ўраўнілаўкай павінны стаяць у цэнтры ўвагі нашай прамысловасьці, сацыялістычнага земляробства, жыцьцёвагадоўлі і транспарту.

Паколькі мы яшчэ далёкі ад правільнай арганізацыі працы на некаторых нашых прадпрыемствах можна бачыць хоць-бы на прыкладзе заводаў цукровай прамысловасьці. Старшыня Саюзцукру тав. Аізнцоў пасьля аб'езду цукровых заводаў прышоў да наступных вываадаў:

«Цукровыя заводы ня былі падзелены на цэхі. З паасобных зьвеньяў прапасу ўлік прыводзіўся па колькасьці пераапрацаваных буракоў.

На цукровых заводах «ня быў пастаўлен улік атрыманага цукру нават у канцы самога вырабу».

На цукровых заводах «ня было анэмкі работы паасобных зьвеньняў, ня было адказнасьці за павышэньне выхадаў цукру і рабочыя не маглі быць мабілізаваны на барацьбу за цукар».

«Заводы ня мелі капкретных плянаў загатоўкі буракоў і тэрмінаў іх дастаўкі на завод».

Можна было-б працягваць апісаньне ўстаноўленых спецыяльнымі абсьледаваньнямі агідпасьцяй у цукровай прамысловасьці. Але і прыведзеных фактаў даволі.

Вядома таксама, што трэба было ўжыць рашучыя захады аж да зьмены кіраўнікоў для таго, каб зараз-жа разгарнуць барацьбу за паляпшэньне справы ў цукровай прамысловасьці і, перш за ўсё, за ліквідацыю буйнейшых недахопаў у арганізацыі працы па цукровых заводах. Можна не сумнявацца ў тым, што рашучае выкрыцьцё недахопаў паслужыць да паскоранага паляпшэньня справы ва ўсёй цукровай прамысловасьці. Без ліквідацыі ўраўнілаўкі і абязьлічкі і без узьняцьця ўсёй справы арганізацыі працы на нашых прадпрыемствах нельга па-сапраўднаму весьці барацьбы за выкананьне асноўнай задачы 1932 г. — завяршэньне пяцігодкі за 4 гады.

б) **Пытаньні арганізацыі працы ў калгасах** павінны займаць асобнае месца. Указаньні партыі на ліквідацыю абязьлічкі і ўраўнілаўкі і тут павінны знайсьці сваё дастасаваньне. Аднак, у калгасах ёсьць свае асаблівасьці, якіх няма ў прадпрыемствах прамысловасьці, або, скажам, у саўгасах. Апошні зьезд Саветаў падкрэсьліў недахопы ў рабоце калгасаў, сказаўшы: «галоўнейшымі і самымі шкодлівымі недахопамі ў рабоце калгасаў у 1930 годзе былі, па-першае, разьмеркаваньне калгаснага даходу не па колькасьці і якасьці працы калгасьніка, а па душах і, па-другое, няўменьне і дрэнная арганізацыя, у асаблівасьці ва ўборцы ўраджаю». У мінулым годзе мы, нясумненна, дабіліся пэўных результатаў па зьнішчэньні гэтых недахопаў у калгасным будаўніцтве.

Аднак, калгаснае будаўніцтва ідзе такімі шпаркімі тэмпамі наперад і пастолькі шпарка вырастаюць новыя тысячы калгасаў, што ўказаныя зьездам Саветаў недахопы і цяпер ва многіх выпадках зьяўляюцца галоўнай перашкодай ва ўзьнікненьні прадукцыйнасьці працы ў калгасах, і ў прыватнасьці ў паляпшэньні справы ўборкі. На аснове вопыту мінулага году, калі калгасы ўжо дасягнулі абсалютнай перавагі ў сельскай гаспадарцы, трэба праверыць, як ажыцьцяўляліся на практыцы ўказаньні VI зьезду Саветаў аб разьмеркаваньні даходаў у залежнасьці ад колькасьці і якасьці працы калгасьніка і забясьпечыць узмацненьне матар'яльнай зацікаўленасьці калгасьніка ў результатах вытворчасьці і, разам з тым, умацаваньне калгасаў, як буйной сацыялістычнай гаспадаркі. Але асноўны вывад і без таго ясны. Без паляпшэньня арганізацыі працы, або, інакш кажучы, без патрэбнага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў нельга забясьпечыць росту калгасаў, як сацыялістычных форм гаспадаркі і выкананьня пастаўленых перад імі задач па сканчэньні пяцігодкі за чатыры гады.

в) **Разгортваньне таваразвароту.** Пытаньні паляпшэньня спажываньня рабочых стаялі ў гэтым годзе ў ліку асноўных задач савецкай улады. Над гэтымі пытаньнямі працавала ўся партыя. Нясумненна, поўнае паляпшэньне за гэты год было дасягнута. Павышэньне цэн па некаторыя тавары ні ў якай меры не адбілася па таваразвароце, наадварот, таваразварот значна ўзьняўся. Але па дасягнутых результатах ні ў якай меры супакоіцца нельга. У 1932 годзе фонд тавараў шырокага спажываньня значна ўзрастае. Гэты фонд узьнімаецца, калі лічыць па раздробных цэнах мінулага году, з 27,2 мільярдаў рублёў да 35,5 мільярдаў рублёў, г. зн., раздробны зварот сацыялістычнага сэктару ўзрастае па 30 проц.

Загатоўкі с.-г. прадуктаў у мінулым годзе значна ўзрасьлі супроць адпаведнага перыяду мінулага году. Ня гледзячы на засуху, у радзе асноўных раёнаў нашы загатоўкі збожжа ў гэтым годзе ідуць вышэй летуценных. Ня гледзячы на невыстарчальнасьць тэмпаў загатовак бавоўны, цяперашнія загатоўкі бавоўны ўжо перавысілі загатоўкі мінулага году. Загатоўкі бульбы і яек, а таксама махоркі перавышаюць адпаведныя загатоўкі мінулага году на 20-50 проц. Загатоўкі мяса, масла, сланечніка і ільнянога семя перавысілі на 50-100 проц. адпаведныя загатоўкі 1930 году. Загатоўкі ільну, пянькі, ільна-валакна і тытуню больш, чым на 100 проц. перавышаюць адпаведныя лічбы мінулага году. Толькі па буракох загатоўкі менш, чым у 1930 годзе. Такім чынам, фонды с.-г. тавараў, харчовых і іншых значна ўзрасьлі ў мінулым годзе. Небяспека і надалей змагацца за забясьпячэньне прынятай праграмы с.-г. загатовак.

У мэтах разгортваньня прамысловасьці, якая вырабляе прадметы шырокага спажываньня, у 1932 годзе намечан рад новых пабудоў. Прычым, націск робіцца на разгортваньні будаўніцтва ў адаленых ад цэнтру раёнах. Так, у Сярэдняй Азіі пастаноўлена прыступіць да пабудовы новага магутнага тэкстыльнага камбінату, ма ючы на ўвазе паляпшэньне снабжэньня тканінамі насельніцтва Сярэдняй Азіі і Сібіру. Намечана вялікая праграма разгортваньня будаўніцтва цукровых заводаў, прычым галоўная частка гэтых заводаў павінна быць пабудавана ў Казакстане і на Дальнім Усходзе.

Прынятая ў 1931 годзе праграма будаўніцтва мясных камбінатаў і кансэрвовых заводаў будзе разгорнута ў мопненай увазе савецкай улады да паляпшэньня справы снабжэньня рабочых і ўсёй масы працоўных.

Першачарговае значэньне набыло пытаньне аб разгортваньні гандлёвай сеткі, аб пабудове новых магазынаў. Прыватны гандаль, які за апошнія гады згортваецца, далёка ня быў замены кааперацыйнымі і дзяржаўнымі магазынамі. Таму ў мінулым годзе была значна пашырана сотка магазынаў як па лініі Цэнтрасаюзу, так і па лініі дзяржаўнага гандлю, а таксама саматужна-прамысловай кааперацыі. На 1932 год задача разгортваньня магазынаў набывае яшчэ большае значэньне. Арганізацыя ня менш 10 тысяч магазынаў, з іх ня менш 5 тысяч па лініі Цэнтрасаюзу і таксама ня менш 5 тысяч па лініі Наркамснабу і, апрача таго, пашырэньне сеткі магазынаў іншых гаспадарчых наркаматаў — бязумоўна неабходна. Без разгортваньня дзяржаўна-кааперацыйнага таваразвароту і без усямернага развіцьця савецкага гандлю пры патрэбным забясьпячэньні савецкай палітычкай цэн — нельга належным чынам узьняць справу снабжэньня, якая зьяўляецца адной з важнейшых прадпасылак выкананьня пастаўленых задач і, перш за ўсё, задачы — пяцігодка за чатыры гады.

г) **Правядзеньне гаспадарчага разрахунку.** У справе ўкараненьня гаспадарчага разрахунку за прайшоўшы год зроблен вялікі крок наперад. Паколькі ад правядзеньня гаспадарчага

Аб народна-гаспадарчым пляне на 1932 год

Дакład старшыні СНК СССР тав. МОЛАТАВА на 2-й сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР

А што мы маем у сучасны момант? Як стаіць справа з нашым гаспадарчым апаратам і з дзяржорганамі ў цэлым на даным моманту? На гэта пытаньне я адказку словамі тав. Андрэева, які, азнаёміўшыся з апаратам НКШЗ, даў наступную характарыстыку гэтаму апарату. Тав. Андрэеў піша аб НКШЗ:

«Апараты стваралися самацёкам. Адсутнічае арганізацыйная выразнасьць пабудовы апаратаў і дакладнае разьмежаваньне функцый і абавязкаў паміж установамі і паміж адказнымі выканаўцамі. Ня гледзячы на правядзеньне савецкай чысткі, апарат зноў засмечан нягодными работнікамі».

Далей: «Поўнасьцю адсутнічае улік работы апаратаў у цэлым і асобных адказных выканаўцаў. Таксама адсутнічае кантроль і праверка выкананьня ў апэрацыйных цэнтральных кіраўніцтвах НКШЗ».

Яшчэ далей: «Безкантрольны рост апарату прывёў да таго, што ў НКШЗ ня было дакладнага вучоту ні ліку цэнтральных установаў НКШЗ, ні штатных кантынгентаў, ні паяўных работнікаў. Дакладныя даныя былі ўстаноўлены толькі ў ходзе работы па скарачэньні штатаў НКШЗ». Тав. Андрэеў, сразумела, не абмежаваўся канстатаваньнем гэтых фактаў, а шчыльна заняўся апаратам НКШЗ. З прычыны таго, што ўвесь апарат НКШЗ па 1 кастрычніка складаў 6.954 чалавека, а па штатах—7.960 адзінак, што яўна не адказвае штатарасам справы, НКШЗ было прадвяжена скарачэньне на 2.204 чалавекі, а па штатах—на 3.195 адзінак. Цяпер правядзецца і рад іншых мерапрыемстваў па паляпшэньні апарату НКШЗ. Ясна, аднак, што факты, якія адносяцца да НКШЗ, павінны паслужыць урокам ня толькі для транспарту, але і для іншых гаспадарчых арганізацый.

Час ужо, на самай справе, пакончыць з самацёкам і бесклапотнасьцю ў адносінах арганізацыі справы ва ўстановах. Пара пакласьці канец барскі-пагардлівым адносінам да работы па паляпшэньні апарату кіраўніцтва. Як барскі-пагардлівыя адносіны, так і пробна-буржуазная нецадзонка ў адносінах ролі дзяржапарату ня маюць нічога агульнага з інтарэсамі рабочай класы, з выкананьнем абавязку камуністаў-кіраўнікоў савецкіх і гаспадарчых установаў. Для паляпшэньня справы ў органах гаспадарчага кіраўніцтва, у нас стварыліся цяпер значна больш спрыяючыя ўмовы. Гэта ня цяжка паказаць.

У асноўнымі інтэлігенцыі і, у прыватнасьці, сярод інжынерна-тэхнічных кадраў пасьля пяцьгадовых хістаньняў і контр-рэвалюцыйных выпадкаў пачуцьця часу, адбыўся прыкметны паварот у бок савецкай улады. Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы адыгралі тут рашаючую ролю. Гэта, так сказаць, адзін бок справы. Другі заключаецца ў тым, што справа падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў спэцыялістаў таксама прыкметна ачушылася. Гэта можна і пострахаваць вельмі простымі і пераканальнымі лічбамі. Вось факты. Да пачатку пяцігодкі, у 1928 годзе, ва ўсіх нашых ВТНУ навучалася 87 тыс. чалавек. Да сучаснага моманту ў нашых ВТНУ ужо 273 тыс. вучняў, г. зн. у тры разы больш. На працягу 1932 году лік вучняў ва ВТНУ ўзрасьце да 380 тыс. Такі-ж малюнак мы маем у тэхнікумах. У 1928 годзе ў тэхнікумах было 149 тыс. вучняў. Да сучаснага моманту ў тэхнікумах навучаецца 511 тыс. г. зн. колькасьць вучняў у тэхнікумах узрасла за тры гады амаль у 3 з пал. разы. Да канца будучага году ў нашых тэхнікумах мяркуецца мець 725 тыс. вучняў. У сувязі з гэтымі лічбамі прыходзіцца напамінаць аб разгалосьсях, якія меліся ў свой час у нашым асяродзьдзі па пытаньні аб ВТНУ і тэхнікумах. Некаторыя таварышы 3-3 з пал. гады таму назад лічылі спрочным ня толькі перадачу ўсіх ВТНУ і тэхнікумаў па адпаведных гаспадарчых камісарыятах, але рашуча пярэчылі нават супроць перадачы некалькіх ВТНУ і тэхнікумаў гэтым наркаматам, хаця-б у відзе вопыту. Партыя дала рашучы адпор гэтым настроям. Цяпер відаць, наколькі прынятая пастанова была своячасовай. Хто-ж можа адмаўляць, што калі-б тады ня былі прыняты гэтыя пастановы, дык мы ў справе падрыхтоўкі патрэбных для сацыялістычнага будаўніцтва кадраў знаходзіліся-б проста ў жалкім становішчы. Хуткі рост падрыхтоўкі кадраў, зразумела, мае ня мала сваіх недахопаў. Трэба сур'ёзна заняцца праверкай усёй работы па падрыхтоўцы кадраў, па арганізацыі гэтай справы, па забесьпячэньні ў гэтай справе належнага кіраўніцтва.

Але, з другога боку, усё-ж нясумненна, што нашы кадры, дзякуючы прынятым у свой час мерам, у выліарнай меры ўзрасьлі, прайшлі ўжо не малую школу вучобы, даюць нам магчыманя раней магчымасьці ў паляпшэньні работы нашых гаспадарчых арганізацый і ўсяго дзяржапарата апарату. Трэба толькі, каб кіраўнікі нашых гаспадарчых органаў пабальшавіцку, па сапраўднаму ўзяліся за паляпшэньне работы апарату, за падбор людзей, за іх расстаноўку і, галоўнае, за наладжаньне сапраўднай праверкі выкананьня. Адсутнасьць праверкі выкананьня ў даных умовах зьяўляецца самым буйным недахопам у рабоце нашых гаспадарчых органаў і апарату кіраўніцтва у цэлым. Тут мы яшчэ моцна кульгаем, так сказаць, на ўсіх франтох. Таму мы спадзяемся, што Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саветаў ухваліць сфармуляваную ў праекце СНК прапанову аб праверцы выкананьня. Тут гаворыцца пастучнае: «У цэнтры ўвагі ўсіх савецкіх і гаспадарчых органаў (ВСНГ, Наркамснаб, НКШЗ, Наркамзем, гаспадарчыя аб'яднаньні і г. д.) павінна быць пастаўлена праверка выкананьня пастаноў партыі і ўраду і іх уласных пастаноў. Практычная работа ўсіх савецкіх і гаспадарчых органаў павінна быць перавезена з рэек дэкрэтна-дырэктыўных пастаноў і распараджэньняў на рэйкі сыстэматычнай праверкі выкананьня на справе даных падпарадкаваным органам заданьняў». Перавод практычнай работы ўсіх нашых органаў з рэек дэкрэтна-дырэктыўных пастаноў і распараджэньняў на рэйкі сыстэматычнай праверкі выкананьня на справе даных падпарадкаваным органам заданьняў, павінен быць ажыцьцёўлен пасьлядоўна, па-бальшавіцку. За праверку выкананьня павінны ўзяцца самі кіраўнікі ўстаноў і гаспадарчых арганізацый. Нельга гэту справу перакладваць на другіх. Больш таго, іменна ў ходзе праверкі фактычнага выкананьня і будзе па-сапраўднаму расьці наш гаспадарчы вопыт, наладжваецца сапраўднае гаспадарчае кіраўніцтва, забясьпечваецца на справе правядзеньне палітыкі партыі. Нашым народна-гаспадарчым планам даецца палітычная ўстаноўка для ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва. Ператварэньне ў жыцьцё гэтай палітычнай установкі залежыць, перш за ўсё, ад таго, якімі тэмпамі пойдзе наперад аўладаньне намі тэхнікай вытворчасьці і кіраўніцтва, уключаючы ў гэта і пытаньні арганізацыі працы. А гэта, у сваю чаргу, ва многім залежыць ад таго, наколькі ўзьнімецца справа праверкі выкананьня. Наладжаньне праверкі выкананьня і забесьпячэньне канкрэтнага кіраўніцтва ёсьць на сутнасьці два бакі адной і тэй-жа справы. Таму ў апошні час і праводзіліся поўныя арганізацыйныя перабудовы ў гаспадарчай галіне, як, напрыклад, разбурэньне гаспадарчых аб'яднаньняў.

Пры вялізарным росьце сацыялістычнага будаўніцтва за апошнія гады і далейшым гігантскім разгортваньні задач савецкай улады, у будучым годзе гэтыя арганізацыйныя пытаньні, і асабліва праверка выкананьня, набываюць важнейшае значэньне. Без пераводу на новыя рэйкі работы ўсіх савецкіх і гаспадарчых органаў і без забесьпячэньня па справе праверкі выкананьня і канкрэтнага кіраўніцтва нельга па-сапраўднаму разгарнуць фронт барацьбы за выкананьне цэнтральнай задачы народна-гаспадарчага пляну—за скарачэньне пяцігодкі за чатыры гады. Такімі асноўнымі задачы момату, на вырашэньні якіх мы павінны згуртаваць максымум сіл пад кіраўніцтвам нашай партыі.

IV. Аб міжнародным становішчы і барацьбе за мір

У маю задачу по ўзнаходжаньню падрабязнае вытлумачэньне пытаньняў, якія адносяцца да міжнароднага становішча СССР. Абмежуюся толькі тымі, што маю найбольш актуальнае значэньне для даннага моманту. У цэлым, у адносінах да СССР з капіталістычнымі краінамі за прайшоўшы час не адбылося якіх-небудзь змен. З тымі краінамі, з якімі Савецкі Саюз меў раней нармальныя або прыязныя адносіны, у нас і зараз поўнасьцю захаваліся гэтыя адносіны. Савецкі ўрад робіць усё для таго, каб і далей праводзіць гэтыя адносіны на аснове шэрага ўстаноўленых прынцыпаў савецкай палітыкі. З тымі-ж краінамі, з якімі мы ня лічылі нашы адносіны дыпэ ізаваньнымі, савецкі ўрад імкнуўся забясьпечыць палепшэньне ўзаемаадносін. І гэта таксама цалкам адпавядае палітыцы, якая праводзілася савецкай уладай.

У адпаведнасьці з гэтай палітыкай, а палітыкай пасьлядоўнай абароны справы ўсеагульнага міру, СССР выступіў да перагавораў аб пакце нападу з Польшчай. Гэтыя перагаворы пачнуцца прадугледжана. Мы імкнемся да таго, каб яны скончыліся добра. Ва ўсякім выпадку ўсё, што залежыць ад СССР, рабілася і робіцца ў гэтых адносінах.

У апошні час нам зроблена прапанова аб заключэньні пакту аб ненападзе з боку Румыніі, Фінляндыі і Польшчы. Мы лічым, што заключэньне такіх пактаў аб ненападзе з гэтымі, як і іншымі, і асабліва пагранічнымі з СССР краінамі, цалкам адпавядае агульнай палітыцы савецкай улады і ўстаўленым задачам савецкай палітыкі ўсеагульнага міру. Як і раней, мы імкнемся да міру. Як і раней, мы імкнемся да таго, каб паставіць пытаньне аб ненападзе на рэйкі практычнага ажыцьцяўленьня. Усё, што залежыць у гэтых адносінах ад СССР, праводзіцца савецкім урадам.

Важнейшым для нашага замежнага становішча пытаньнем зьяўляюцца, вядома, падзеі на Далёкім Усходзе. Факты—падзеі ў Манчжурыі. Факты паказваюць аб тым, што маштаб гэтых падзей ня толькі не скарачаецца, але ня ўтрымлівае тэндэнцыю да далейшага і ня ўтрымлівае тэндэнцыю да далейшага і ня ўтрымлівае тэндэнцыю да далейшага і больш буйнага пашырэньня. Вядома, што Ліга нацый прабавала ўмешваць—з ваенныя падзеі, якія адбываюцца ў Манчжурыі, але гэта ўмешваньне, ні ў якай меры не адбілася ў бок ўмацаваньня дапераднай акупацыі Манчжурыі і спыненьня ваенных дзеянняў. Результаты гэтага ўмешваньняў. Результаты гэтага ўмешваньня проста процілеглыя. Два разы Ліга нацый прабавала выступіць з такімі-такімі канкрэтнымі прапановамі о пераводу акупацыі Манчжурыі. Мы ведаем, да чаго гэта прывяло.

У пачатку падзей Ліга нацый пачала пашыраць пайную далю, з імкнення скалочваньня ваенна-палітычных блёкаў для новых імпэрыялістычных войнаў.

—14 кастрычніка, з якой зьявіліся ў колах ліцэй пакоит магчымасьці пейкага пералому да лепшага, г. зн. да згортваньня ваенных дзеяньняў у Манчжурыі. Але пітога падобнага ня здарылася. Насьля новага і вельмі доўгага абмеркаваньня Ліга нацый нядаўна разразілася рашэньнем аб пасылцы ал імя нці дзяржаў у Манчжурыю... навукова-дасьледчай камісіі, г. зн. даказала сваё поўнае нежаданьне і бяссільле ў якой-бы там ні было меры перашкодзіць далейшаму разгортваньню ваенных падзей у Манчжурыі. Гэта другое рашэньне Лігі нацый зьяўляецца простым зьдзекам над яе-ж уласнай першай пастановай, а па сутнасьці асьвячае ваенную акупацыю і далейшае разгортваньне ваенных падзей у Манчжурыі.

Усё гэта прымушае нас узмацніць пільнасьць у адносінах падзей на Далёкім Усходзе. Мы ня можам забываць, што нашы граніцы шуміць ускоўж манчжурскай лініі. Мы не сумняемся, што нашы далёка-ўсходнія героі будуць на вышыні становішча і будуць пільнымі ў адносінах да савецкіх границ на Далёкім Усходзе (доўгія апляўдысмэнты).

Рабочыя і працоўныя масы вёскі Савецкага Саюзу заняты сваімі ўнутранымі справамі, яны захоплены заданьнямі ўзьнову гаспадаркі, задачамі палепшэньня свайго жыцьця. Таго-ж яны жадаюць і рабочым іншых краін. Але надзеі міжнароднага жыцьця патрабуюць ад нас узмоцненай пільнасьці. І мы зноў падкрэсьліваем наш асноўны прынцып: чужой зямлі нам ня траба, але і адзай пядзі сваёй зямлі мы нікому ня ўступім (апляўдысмэнты).

Набліжаецца скліканьне камісіі па разбраеньні. Вакол даты скліканьня гэтай камісіі—2 лютага 1932 году—цяпер ідзе некалая палітычная гульня імпэрыялістычных урадаў, інтарэсы якіх ня маюць нічога супольнага са справай разбраеньня. Робяцца спробы адтэрміноваць і паотул зьняць пытаньне з камісіі па разбраеньні. Яшчэ больш, з боку вядучых імпэрыялістычных сіл робіцца ўсё для таго, каб камісію па разбраеньні ператварыць у камэдыю, якая зусім не стварае ніякіх затрудненьняў для паноў імпэрыялістаў у справе далейшых узбраеньняў. Усё робіцца для таго, каб камісія па разбраеньні не займалася сваёй непасрэднай задачай і зусім не перашкаджала-б росту ўзбраеньняў, асабліва мацнейшых імпэрыялістычных дзяржаў. Апошнія бачаць сэнс свайго ўдзелу ў гэтай справе толькі ў тым, каб, прыкрываючыся ўдзелам у камісіі па разбраеньні, пакінуць сабе зусім вольныя рукі для шалёлічэньня сваіх узбраеньняў і скалочваньня ваенна-палітычных блёкаў і ваеннага нападу на нашу дзяржаву. Мы павінны быць гатовы і надалей да гэтых правакацый.

Мы адказваем на ўсё гэта пасьлядоўным правядзеньнем палітыкі міру. Мы адказваем на гэта павялічэньнем нашай пільнасьці. Мы адказваем на гэта ўзмацненьнем будаўніцтва і перш за ўсё тым, што змагаемся ўжо ў 1932 годзе за скарачэньне пяцігодкі. У нашай краіне б'е ключом творчая работа, адбываецца гігантскае будаўніцтва, пераможна будуецца сацыялізм. У гэтым мы бачым умацаваньне ня толькі нашых унутраных, але і міжнародных пазыцый. Пераможным ажыцьцяўленьнем народна-гаспадарчага пляну, скарачэньнем пяцігодкі за чатыры гады, разгорнутай на ўсім фронце барацьбой за справу сацыялізму адкажам нашым клясавым ворагам. **Наша задача—умацаваньне справы ўсеагульнага міру і міжнароднага сацыялізму, забесьпячэньне перамогі рабочай клясы.** (Доўгія апляўдысмэнты).

Аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні

Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

1. КП(б)Б на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і не недарыўнай часткі—ленінскай нацыянальнай палітыкі, у барацьбе супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, шавінізмаў іншых нацыянальнасьцей і нацыянал - апартуністычнай агентуры ў радох партыі, дасягнула вялізарных посьпехаў па ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Дзякуючы брацкай дапамозе пралетарыяту СССР, шырокімі тэмпамі (перавышаючымі агульнасаюзныя) разгортваецца прамысловасьць БССР (пабудован рад новых буйных прадпрыемстваў: Гомсельмаш, Асінбуд, ф-ка штучнага валакна і інш.), што значна павялічыла рады пралетарыяту і павысіла вядучую ролю прамысловасьці ў народнай гаспадарцы БССР. КП(б)Б дасягнула рашаючых посьпехаў і ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі (калектывізацыя 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, павялічэньне пасеўных плошчаў, асабліва пад тэхнічнымі культурамі, узмацненьне і рост саўгасаў, асабліва спэцыялізаваных жывёлагадоўчых і інш.).

Вялізарны рэзмах культурнай рэвалюцыі, увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня, посьпехі ў ліквідацыі пішысменнасьці, буйны рост сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў, значнае павялічэньне пралетарскай праслойкі ў гэтых установах, посьпехі мастацтва БССР, абслугоўваньне нацменшасьцей на роднай мове,—усё гэта сьведчыць аб тым, што КП(б)Б з посьпехам выконвае задачу ліквідацыі эканамічнай і культурнай адсталасьці БССР.

2. ЦК канстатуе, што, ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні ЦК КП(б)Б па ўзмацненьні барацьбы з ухіламі ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму ў радзе зьвеньняў партыйнай арганізацыі, гэта задача не знайшла неабходнага адлюстраваньня і нават у радзе месц ёсьць выпадкі аслабленьня барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам. Рад вылазак вялікадзяржаўнага шавінізму не сустракаюць патрэбнага адпору з боку асобных нізавых партарганізацый. Не пастаўлена сыстэматычная барацьба з прымярэнчымі адносінамі да ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму. На вуковыя таварыствы і гурткі праявілі пасьпяныя адносіны да задачы мабілізацыі тэарытычнай думкі партыі па барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам.

3. Актывізацыя ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму за апошні час праявілася ў радзе вылазак. Адной з такіх вылазак зьявілася выступленьні групы вучоных і літаратараў (Вальфсон, Выдра і інш.), якія выходзілі ў сваёй крытыцы нацыянал-дэмакратызму не з марксыцка-ленінскай пастаноўкі нацыянальнага пытаньня, а з пазыцый вялікадзяржаўных ухілістаў (процістаўленьне нацыянальнай формы культуры не пралетарскаму зьместу, разважаньні аб перапавялічэньні «асабліваснасьцей» беларускай нацыі, насьмешлівыя і лагардлівыя адносіны да раду «дробязей» нацыянальнай культуры, быту і г. д.).

Праяўленьнем вялікадзяржаўнага ўхілу зьяўляўся падзел асобнымі гісторыкамі-марксыстамі (Югаў) камуністаў на вялікарускіх, з адпаго боку, і беларускіх, украінскіх і г. д.—з другога боку, што стварала антаганізм і прывяло да лагардлівых, нетаварыскіх адносін да пасобных беларускіх работнікаў.

Аслабленьне работы па беларусізацыі, якое наглядзецца то ў адной, то ў другой партыйнай арганізацыі, на жэньне, але ня зьнічаны. Работа ў пралетарскім масам, значэньня працы ЦК КП(б)Б прыходзілася ня раз, паказваць (Віцебск і інш.), зьяўлялася вынікам недаацэнкі нацыянальнага пытаньня і прымірэнчых адносін да ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму.

Выходзячы з гэтага, ЦК КП(б)Б лічыць першачарговай задачай усёй КП(б)Б—павысіць пільнасьць да вылазак і праяўленьняў вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і арганізаваць яшчэ больш актыўную барацьбу з ім, наносячы рашучы ўдар па апартуністычным і абываталькім прымірэнцтве да вялікадзяржаўнага ўхілу.

4. Барацьба супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму вялася, вядзецца і будзе правоўціцца ўсёй КП(б)Б з бальшавіцкай цьвёрдасьцю і настойлівасьцю. Разгортваньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і значныя посьпехі, дасягнутыя КП(б)Б у індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, было немагчыма без рашучай барацьбы КП(б)Б з усімі праяўленьнямі апартунізму і шавінізму, у тым ліку без пасьпяховай барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і яго нацыянал-апартуністычнай агентурай у радох партыі.

Адначасова ЦК лічыць, што прынятыя ў радзе кіруючых артыкулаў, заць верджаных ЦК у 1929 г. і пачатку 1930 г., а таксама прынятыя ў пастановах XIII зьезду КП(б)Б па дакладу аб прафсаюзах лёзунг аб тым, што нацыянал-дэмакратызм зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, зьяўляўся памылковым лёзунгам. Такая пастаноўка пытаньня супярэчыла пастановам XII зьезду РКП(б) і XVI зьезду УсеКП(б). У поўнай суадпаведнасьці з пастановамі і ўказаньнямі XVI зьезду УсеКП(б) КП(б)Б неадкладна пасьля зьезду прыняла ўстаноўку аб тым, што галоўную небясьпеку на даным этапе прадстаўляе вялікадзяржаўны ўхіл, «які імкнецца рэвізаваць асновы ленінскай нац. палітыкі і пад сьцягам інтэрнацыяналізму, прыкрываючы імкненьні аджываючых клясаў панаваўшай раней вялікадзяржаўнай нацыі, вярнуць сабе страчаныя прывілеі» (XVI зьезд УсеКП(б).

5. Няўпасьць на вызначаным этапе няправільнага лёзунгу аб тым, што нацыянал-дэмакратызм зьяўляецца галоўнай небясьпекай, не дае ніякіх падстаў рэвізаваць правядзеную КП(б)Б барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам. Выкрыцьцё і барацьба супроць нацыянал-дэмакратызму і яго агентуры ў радох партыі—нацыянал-апартунізму была правядзена кампартыяй Беларусі зусім правільна.

ЦК лічыць усе партарганізацыі КП(б)Б даць бязьлітасны адпор усялякім спробам пераглядзець, або ахаяць памятку партыі ў барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам. Пасьлядоўная і непрымірымая барацьба супроць нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму складае і надалей важнейшую задачу ўсёй КП(б)Б.

Памылковасьць лёзунгу аб нацыянал-дэмакратызьме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, заключалася ў тым, што гэты лёзунг не канцэнтраваў галоўнага агню супроць вялікадзяржаўнага ўхілу і тым самым не садзейнічаў неабходнай мабілізацыі партыйных сіл на барацьбу з ім.

6. ЦК КП(б)Б заклікае мясцовыя партарганізацыі да большай пільнасьці і ў адносінах ухілу ў бок мясцовага (беларускага, польскага, яўрэйскага і інш.) шавінізму. Нацыянал-дэмакратызм і нацыянал-апартунізм у выніку пасьляўпяй барацьбы КП(б)Б пацярпелі жорсткае паражэньне, але ня зьнічаны.

нацыянал-дэмакратычных элементаў і цяпер працягваецца.

Разьбіты і скампраметаваны ў вачох шырокіх мас працоўных контр-рэвалюцыйны нацыянал - дэмакратызм будзе выяўляцца як у старых, так і ў новых некалькі іншых формах. Гэта патрабуе далейшага ўзмацненьня пільнасьці з боку ўсёй КП(б)Б да ўсялякіх праяўленьняў у радох партыі ўхілу ў бок мясцовага беларускага шавінізму.

«Сутнасьць уіхлу да мясцовага нацыяналізму заключаецца ў імкненьні абасобіцца і замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай шкарлупы, у імкненьні затушаваць клясавыя супярэчнасьці ўнутры сваёй нацыі, у імкненьні абаранiцца ад вялікарускага шавінізму, шляхам адыходу ад агульнага пэтоку сацыялістычнага будаўніцтва, у імкненьні ня бачыць таго, што зьбліжае і злучае працоўныя масы нацыянальнасьцей СССР і бачыць толькі тое, што можа іх ададзіць адну ад другой» (СТАЛІН).

Адной з форм праяўленьняў ухілу у бок мясцовага шавінізму зьяўляецца падыход да нацыянальных кадраў без уліку ідэалёгічнай выстрыманасьці і сацыяльнага складу гэтых кадраў, забываючы і затушоўваючы тое, што адзіным крытэрыем для ацэнкі камуніста зьяўляецца ступень яго партыйнай вытрыманасьці і здольнасьць на справе ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

7. ЦК зварачае сур'ёзную ўвагу ўсёй КП(б)Б на неабходнасьць значнага ўзмацненьня справы падбору і ўцягненьня ў кіруючую партработу партыйна-вытрыманых кадраў беларускіх работнікаў і іх выхаваньне ў духу бальшавіцкай непрымірымасьці да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. «Апіраючыся на посьпехі прамысловага будаўніцтва, партыя павін на шырока разгарнуць вылучэньне рабочых на партыйную, савецкую і гаспадарчую работу, абапіраючы гэта вылучэньне з выхаваньнем і падрыхтоўкай новых кадраў» (кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б, 1930 г.). Пры гэтым неабходна, разам з уважлівымі, беражлівымі адносінамі да камуністычных кадраў КП(б)Б, разгортваць бальшавіцкую самакрытыку, рашуча выцягваючы памылкі і скажэньні генэральнай лініі партыі, а таксама вядучы барацьбу супроць канкретных посьбітаў вялікадзяржаўнага і мясцовага шавінізмаў.

8. КП(б)Б і далей будзе бязьлітасна змагацца супроць недаацэнкі работы сярод нацыянальных меншасьцей (наймаў, яўрэяў і інш.), супроць антысэмітызму і ігнараваньня работы сярод працоўных палякаў. Разгортваньне і далейшае ўзмацненьне работы сярод нацыянальных меншасьцей БССР зьяўляецца недаўпай часткай барацьбы за ленінскае вырашэньне нацыянальнага пытаньня. ЦК патрабуе ад усіх партарганізацый сапраўднага палепшэньня культурна - эканамічнага абслугоўваньня працоўных нацменшасьцей, даючы бязьлітасны адпор імкненьням клерыкальных і шавіністычных элементаў разбурыць адзінства працоўных розных нацыянальнасьцей, памятаючы, што толькі ўважлівым адносінам да штодзённых патрэб нацыянальных меншасьцей можна ашчэ ў большай ступені актывізаваць іх удзел у агульным сацыялістычным будаўніцтве.

9. Выходзячы з вышэйазначанага ЦК ставіць перад усёй КП(б)Б наступныя практычныя задачы:

а) неаслабна правоўціць палітыку беларусізацыі, прымаючы рашучыя меры узмоцненьня ў адносінах да тых кіруючых нізавых рабочых і цэнтральных работнікаў, якія ігнаруюць беларусізацыю і асабліва не вывучаюць беларускай мовы;

б) далейшае растлумачэньне шырокім масам працоўных, у першую чаргу пралетарскім масам, значэньня пра вядзімай КП(б)Б беларусізацыі, разгортваючы ўпартую сыстэматычную работу па беларусізацыі рабочай клясы з улікам усіх умоў, адзначаных пастановай кастрычніцкага (1930 г.) пленуму ЦК КП(б)Б;

в) правядзеньне неаслабнага змаганьня з антыленінскай тэорыяй барацьбы дзьвох культур як у яе вялікадзяржаўна-расійскай, так і беларускай разнавіднасьці, ЦК папярэджвае, што абмежаваньне задач па беларусізацыі адным толькі вывучэньнем беларускай мовы зьяўляецца недаацэнкай нацыянальнага пытаньня і што справа сапраўднага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі заключаецца ў аўладаньні партарганізацыяй і рабочай клясай усіма працэсамі нацыянальна-культурнага будаўніцтва (тэарытычны фронт, мастацкая літаратура і творчасьць, агульны фронт мастацтва). Толькі пры гэтых умовах можа быць забясьпечана сапраўднае пралетарскае кіраўніцтва нацыянальна-культурным будаўніцтвам.

г) Узмацненьне ўвагі да пытаньняў разьвіцьця вышэйшых форм беларускай культуры — нацыянальнай па форме, пралетарскай па зьмесьце (літаратура, тэатр, кіно, музыка), дасканалае вывучэньне працэсаў, якія адбываюцца ў гэтай галіне, з мэтай далейшага ўзмацненьня пралетарскага кіраўніцтва гэтымі працэсамі і больш поўнага адлюстраваньня сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва ў розных галінах мастацтва, пакazваючы ударнікаў у літаратуры, тэатры, кіно і г. д.;

д) Узмацненьне спэцыяльнай увагі да сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў БССР з мэтай палепшэньня справы падрыхтоўкі маладых кадраў пралетарскай нацыянальнай інтэлігенцыі, ужыўшы таксама захады да правільнага падбору і ўзмацненьня падрыхтоўкі выкладчыкаў персаналу, здольнага выканаць акрэсьленыя задачы. ЦК даручае культпропу ЦК і Наркамасьветы прыняць неабходныя мерапрыемствы да палепшэньня работы Камвузу імя Леніна, інстытуту гісторыі партыі і Акадэміі Навук БССР і ўзмацненьня іх роли ў справе падрыхтоўкі клясава-вытрыманых навуковых кадраў.

е) Даручыць падкамісіі ЦВК і культпропу ЦК распрацаваць практычныя мерапрыемствы па ўзмацненьні работы ў галіне беларусізацыі сярод рабочых і на ўсіх установах, ужыўшы крокі да самай шырокай мабілізацыі чарговых задач нацыянальнай палітыкі КП(б)Б (на сходах, у гуртках, партшколах і г. д.).

10). ЦК падкрэсьлівае, што правільнае змаганьне за практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі можа з посьпехам праводзіцца толькі на аснове далейшага разгортваньня бязьлітаснай барацьбы супроць вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага шавінізму і контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, шавінізмаў розных колераў і адценьняў і нацыянал-апартуністычнай агентуры ў радох партыі, толькі на аснове аўладаньня і кіраўніцтва з боку партыі і пралетарыяту ўсімі працэсамі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, няўхільна змагаючыся за чыстату генэральнай лініі партыі, даючы рашучы адпор праваму ўхілу — найбольш небясьпечнаму на даным этапе, яго «левым» саюзьнікам і пры мірэнцтву да ўхілаў. БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б і УсеКП(б) і пры брацкай дапамозе пралетарыяту ўсяго Савецкага Саюзу дасягне новых, яшчэ больш посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

АПРАЦАВАНЫ ЛЁН—НА ЗАГАТОЎЧЫЯ ПУНКТЫ

Раўненьне па калгасах Буда-Кашалёўшчыны

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ

Тэмпы ільназагатовак па БССР нарастаюць вельмі слаба. У радзе раёнаў і сельсаветаў (Чырвоная Слабада, Бабруйск, Дрыса) тэмпы ільназагатовак за апошнія дні зьнізіліся. Гэта непапушчальнае зьявішча. У нас ёсьць усе неабходныя прадпасылкі для павышэньня тэмпаў і пасьпяховага выкананьня пляну загатовак. Аб гэтым сьведчаць прыклады Смалявіцкага і Буда-Кашалёўскага раёнаў, дзе калгасы, на аснове пераводу апрацоўкі на зьдзельшчыну і разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва дабіліся перавыкананьня плянаў пераапрацоўкі і здачы ільну дзяржаве.

Аспоўным тормазам выкананьня загатоўчага пляну зьяўляецца зусім невыстарчальнае разгортваньне работы па першапачатковай апрацоўцы ільну і пянькі. Паяўны мяльна-сушыльны інвэнтар вельмі часта не загружаецца і не выкарыстоўваецца.

У Ерукскім, Шклоўскім і іншых раёнах многія сельсаветы і парт'ячэйкі ня прымаюць патрэбных жорсткіх мер да спагнаньня цьвёрдых заданьняў. Замест таго, каб узмацніць націск на кулака, разгарнуць масавую работу, паасобныя работнікі, як старшыня Бучаніцкага сельсавету Аляшкевіч і сакратар парт'ячэйкі Далідовіч ідуць на повадзе ў кулака і патураюць рвацкім настроям адсталай часткі калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Раённыя арганізацыі абавязаны безадкладна ўзмацніць масавую работу, дабіцца штодзённага нарастаньня тэмпаў апрацоўкі, не дапусьціць асяданьня ільнавалакна на мясцох, мабілізаваць калгасьнікаў і аднаасобнікаў для адпору кулацка-рвацкім тэндэнцыям. Жорсткі кантроль за выкананьнем заданьняў і плянаў, апэрацыйнасьць у кіраўніцтве, рашучы націск на кулака — вось што трэба для таго, каб забясьпечыць поўнае і своячасовае выкананьне пляну ільназагатовак.

Пакончыць з апартуністычнымі разважаньнямі аб нерэальнасьці плянаў

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА.

Чырвона-Слабодкі раён не дабіўся пералому ў выкананьні пляну ільназагатовак. Здана дзяржаве 30 проц. ільнавалакна.

Поўную бязьдзейнасьць праяўляюць Бучаніцкі сельсавет (8 проц.), замагільскі (12 проц.) і Жыліхаўскі (21 проц.).

Старшыня Бучаніцкага сельсавету Аліпкевіч і сакратар ячэйкі Далідовіч замест мабілізацыі грамадзянасьці на пасьпяховае выкананьне пляну ільназагатовак, займаюцца апартуністычнымі разважаньнямі: «У нас нэдарод, дрэнны лён, выканаць плян цяжка».

Райкам партыі і райвыканком павінен зрабіць адпаведныя вывады ў адносінах да зрыўшчыкаў ільназагатовак.

Г.

Стаўка на самацёк — прычына адставаньня

ДРЫСА.

Плян ільназагатовак па Дрысенскім раёне выканаў на 70 проц. За пяцідноўку паступіла 49,3 тоны ільнавалакна, або 4,5 проц. пляну.

Да гэтага часу не ўзяліся па-балшэвіцку за работу Дзернавіцкі, Жоўніцкі, Прудзінкоўскі і Луначарскі сельсаветы. Гэтыя сельсаветы за апошнюю пяцідноўку далі зусім нязначны прырост пастуленьня ільнавалакна.

Каркалецкі, Пястоўскі, Сар'янскі і Бігосаўскі сельсаветы зьнізілі тэмпы ільназдачы.

Застаўся зусім кароткі тэрмін для выкананьня плянаў ільназагатовак. Неабходна ўзьняць тэмпы работы, каб забясьпечыць поўнае і безадкладнае сканчэньне ільну. Трэба неадкладна ліквідаваць самацёк у ільназагатоўках, які мае месца ў радзе сельсаветаў Дрысенскага раёну.

Калгасы Буда-Кашалёўшч

СЁНЬНЯ, на 6 гадзіне вечары Менгарком КП (б)Б скліча ў Доме Камасьветы

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАКТЫВУ.

ПАРАДАК ДНЯ:

Ліст тав. **Сталіна** ў рэдакцыю часопісі „Пролетарская революция"—„Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму і задачы гарадзкой партыйнай арганізацыі"

Дакладчык тав. ГЕЙ.

Члены і кандыдаты ЦК, ЦКК, гаркому і гарКК КП(б)Б, члены фракцый прэзыдыуму ЦВК, гарсавету, ЦСПСБ, гарпрафсавету, ЦК прафсаюзу, бюро ЦК ЛКСМБ праходзяць на сваіх мандатах.

Прапануецца сакратаром партколектываў і вячэек КП(б)Б атрымаць білеты ў гаркоме (пакой № 10) 26 сьнежня з 11 гадз. раніцы да 4 гадз. дня.

Менгарком КП(б)Б.

Арганізацыя плодова-гародных і бульбяных таварных калгасных фэрм—забытая галіна работы

Канцэнтрацыя прамыслова-таварных плошчаў, гародаў, садоў і бульбы закон прамысловых цэнтраў і перапрацоўчай прамысловасьці ставіць ва ўвесь мэтай забясьпечыць гарады прадуктамі плодагароднины. На аснове дырэктыў партыі і ўраду Плодагароткалгасцэнтрам праводзіцца работа па арганізацыі буйных плодагародных бульбяных калгасных таварных фэрм, у якіх ужо ў 1932 годзе павінна быць сканцэнтравана ня менш 90 проц. усёй таварнай плошчы садоў, гародаў і бульбы па калгасным сэктары.

Работа па вылучэньні калгасаў і арганізацыі фэрм павінна была быць скончана, паводле пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР, да 15 лістапада г. г. з тым, каб своячасова правесьці падрыхтоўку да правядзеньня весьнавой пасеўнай кампаніі 1932 году, складаньня вытворчых плянаў і г. д.

Арганізацыя плодагародных таварных калгасных фэрм была пачата ў пачатку верасьня і па сёньняшні дзень гэта работа павінна быць скончана.

Адмак, фактычнае становішча па арганізацыі плодагародных таварных калгасных фэрм на 10 сьнежня гаворыць аб пагражаючым становішчы.

Замест 1.750 плодагародных фэрм на 10 сьнежня арганізавана 339, або 19,3 проц. плянавага заданьня. Прычым, з 64 раёнаў да арганізацыі фэрм прыступілі 22 раёны, а 42 раёны нічога не зрабілі. Раёны: Брагінскі, Гарадоцкі, Горацкі, Касьцюковіцкі, Лёзьнянскі, Мазырскі, Полацкі, Пухавіцкі, Пятрыкоўскі, Смаляніцкі, Талачынскі, Хойніцкі, Церахаўскі, Чэрвеньскі, Шклоўскі, Клічаўскі і раёны, атрымаўшыя пазьней заданьні: Бягомльскі, Бярэзінскі, Крупскі, Мсьціслаўскі, Пярыцкі, Сеньненскі, Сіроцінскі, Старобінскі, Стара-Дарожскі, Чашніцкі, Чаўскі, Чырвонапольскі, Камарынскі, Ельскі, Сураскі, Асіповіцкі, Вузьдзенскі і Лоеўскі, якія заданьне па арганізацыі плодагародных таварных калгасных фэрм атрымалі яшчэ ў верасьні, да сёньняшняга дня да арганізацыі іх не прыступілі.

Трэба адзначыць, што і іншыя раёны, якія прыступілі да работы, праводзяць яе марудными тэмпамі. Так, у Менскім раёне замест 100 фэрм арганізавана 17, Магілеўскім замест 90 — 24, Віцебскім замест 90 — 17, Аршанскім замест 120 — 47, Барысаўскім замест 68 — 23, Гомельскім замест 50 — 18, Рэчыцкім замест 50 — 15 і г. д., прычым у пералічаных раёнах скапцэнтравана асноўная плошча гародаў, садоў для забесьпячэньня гарадзкіх цэнтраў прадуктамі плодагароднины.

Недаацэнены арганізацыі буйной сацыялістычнай плодагароднай гаспадаркі з боку некаторых раённых арганізацый і асабліва райкалгасасаюзаў павінен быць пакладзен канец. Работа павінна быць пастаўлена так, каб пралетарскія цэнтры былі забясьпечаны прадуктамі плодагароднины. Разважаньні аб нямэтазгоднасьці і немагчымасьці арганізацыі плодагародных таварных калгасных фэрм павінны атрымаць рашучы адпор. Перахаўскі, Шклоўскі, Талачынскі, Касьцюковіцкі і іншыя раёны павінны зараз-жа па-баявому ўзяцца за арганізацыю ПГКФ.

Трэба памятаць, што ПГКФ адыгрываюць вялізарную ролю ня толькі ў плянавым і поўным забясьпячэньні рабочых прамысловых цэнтраў прадуктамі спажываньня і перапрацоўчай прамысловасьці — сыроцом, а зьяўляюцца і адным з вагароў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, паколькі пры арганізацыі ПГКФ калгасу надаецца пэўны гаспадарчы напрамак (спэцыялізацыя), аб чым ярка падкрэслена ў пастанове лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

«Пленум ЦК і ЦКК абавязвае ўсе партарганізацыі, савецкія, зямельныя і калгасныя органы задачу жывёлагадоўлі, узьнову ўрадлівасьці, разьвіцьця такіх галін гэтай гаспадаркі, як гарадніцтва, садоўніцтва, пчалярства, рыбная гаспадаркі і г. д. паставіць цэнтральнай у гаспадарчым умацаваньні калгасаў, для чаго і забясьпечыць выкананьне пастановы ЦК аб вызначэньні напрамку разьвіцьця (спэцыялізацыі калгасаў)».

Арганізацыя плодагародных таварных калгасных фэрм зьяўляецца адной з чарговых і неадкладных палітычна-гаспадарчых задач. У бліжэйшыя дні павінна быць ліквідавана нагроза зрыву па падрыхтоўцы і правядзеньні весьнавой пасеўнай кампаніі 1932 году па плодагароднае і бульбе ў плодагародных таварных калгасных фэрмах. Арганізацыю ПГКФ скончыць да 1 студзеня 1932 году.

Г. Ф.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

108,9 проц. гадавай праграмы

Рабочы калектыў 4-й істужкі скарняжнай фабрыкі імя 1-га мая да 20 сьнежня выканаў гадавы прамфінплян на 108,9 проц.

Рабочыя 4-й істужкі ўзялі на сябе абавязак настойліва змагацца за выкананьне і перавыкананьне ўсіх якасных паказальнікаў.

Кашырка разгортвае работу

КАШЫРА. З 24-га сьнежня Кашырская электрастанцыя пачала водпуск электраэнэргіі новым гігантам маскоўскай прамысловасьці — заводам «Шарыкападшыпнік», «Фрэзэр», вэлёзаводу і аўтазаводу імя Сталіна. Пачынае працаваць першы савецкі турбагенэратар, змантаваны ў мінімальны тэрмін — 77 дзён.

Выплаўка сталі і чыгуну

На 20-га сьнежня па ўсім Саюзе выплаўлена 14.745 тон чыгуну і 12.381 тон сталі (без малой мэталургіі). Выплаўка чыгуну, у параўнаньні з мінулымі суткамі, узрасла на 169 тон; выплаўка сталі скарацілася на 879 тон.

Здабыча вугалю

За 21-га сьнежня па ўсім Саюзе здабыта 186.923 тоны вугалю — на 9.144 тоны больш, чым за мінулы дзень. 22 сьнежня Данбас даў 138.984 тоны — на 3.285 больш чым пазырадні. Кузбасвугаль выпрацаваў 19.811 тон — па 6.000 тон больш, чым за мінулыя суткі.

Заканчваюцца галоўныя пабудовы Днепрабуду

КІЧКАС. Да 15-га сьнежня на будаўніцтве ўкладзена звыш мільёну кубаметраў бэтону. Мантуюцца 3 агрэгаты ў 300 тыс. кілёват; мантаж будзе скончан да 1-га мая. На запрудзе за 20 дзён сьнежня перакрыта месячнае заданьне. Галоўныя пабудовы, без якіх немагчымы пуск гідрастанцыі, выканан на 95 проц.

Завоз апалу ў Менск

Паступленьне дроў у Менск у сьнежні палепшылася (за 21 дзень прыбыло 1.475 вагонаў, што складае ў сярэднім 70 вагонаў у дзень). Адмак, паказаная колькасьць не забясьпечвае патрэб гораду і прамысловасьці. За апошні час з-за непадачы вагонаў, дровы па чыгуначных пунктах не адгружаюцца. У Асіповіцкім лесправгасе падвесена да чыгункі 575 вагонаў, у Нарыцкім — 400, Пятрыкоўскім — 244, Бабруйскім — 250 і г. д.

Штурмавы 2-хмесячнік на пабудове

Рабочы калектыў пабудовы 112 кватэрнага дому абвясьціў штурмавы двухмесячнік, каб скончыць корпус «А» да 15 лютага 1932 году. Рабочыя пабудовы абвясьцілі слабе ўдарнікамі.

«Дамо 56 кватэр рабочым не пазьней 15-га лютага». — пад такім лёзунгам разгортваецца штурм.

Польская ваеншчына за „работай"

АПРАЦОЎКА „ГАРМАТНАГА МЯСА"

«Газэта Варшавска» ў № 387 за 22-га сьнежня зьяшчае цікавае паведамленьне аб палітычнай работе, якую ў апошні час інтэнсыўна праводзіць польскі фашызм сярод салдатаў. У армеі, асабліва ў апошнія часы, на гвалт прапагандуюцца «фэдэралістычныя» ідэі маршала Пілсудзкага аб вялікай Польшчы «ад мора да мора» ў «фэдэрацыі» з Украінай і Беларусьсю (зразумела, з Менскам і Кіевам).

Прапаганда «фэдэралістычнай» ідэі ў войску патрэбна фашызму для ідэалёгічнай апрацоўкі «гарматнага мяса» з украінскіх і беларускіх рабочых і сялян для вайны з Савецкім Саюзам.

Зразумела, што прапаганда «фэдэралістычных» ідэй мае на мэце таксама спыніць рост рэвалюцыйнага руху ў армеі.

Што такое фашысцкі «фэдэралізм» на справе—аб гэтым лепш за ўсё гавораць **тысячы зруйнаваных украінскіх і беларускіх вёсак, тысячы акруваўленых нагайкамі пацыфікатараў сялянскіх сыпін на Заходняй Украіне і Беларусі.**

Рабочыя і сяляне Зах. Украіны і Зах. Беларусі добра разумеюць маноўр крывавай дыктатуры фашызму і супроць каго накіраваць зброю ў выпадку антысавецкай авантуры пілсудчыны.

Гэты-ж нумар «Газэты Варшаўскай» паведамляе, што на падставе пададзенага ўхваленага соймам закону аб ваенным палатку бюджэт вайсковага міністэрства атрымае на працягу трох год **1.500.000 злотых. Падатак гэты, як вядома, абавязан плаціць усе звольненыя па якіх-небудзь прычынах ад вайсковай службы.**

Правакатары пад апекай улады

ВАРШАВА, 22. Гэтымі днямі ва львоўскім акруговым судзе, як паведамляе «ІКЦ», скончыўся палітычны працэс 8 сялян з **в. Чысталова**, каля Тарнопаля. Галоўныя абвінавачаныя — браты Васіль і Міхась Кісялі і Сьцяпан Грабар.

Працэс даволі цікавы і характэрны. Апрача таго, што ўсіх падсудных абвінавачвалі ў прыналежнасьці да кампартыі, трох пералічаных сялян абвінавачвалі ў забойстве правакатара, нейкага Юркова, а рэшту падсудных — у садзейнасьці забойству. Пракурор дамагаўся пакаранья сьмерцю ўсіх падсудных.

Але, ня глядзячы на ўсе патугі дэфэнзывы, даказаць віну падсудных не ўдалося. Пасьля 4-хдзеннага працэсу суд прыгаварыў: Васіля Кісяля і Сьцяпана Грабара — па 6 год катаргі кожнага, Міхася Кісяля — на 5 год, а рэшту — да 2-х год кожнага.

Рост беспрацоўя ў Польшчы

ВАРШАВА, 23. З кожным днём узрастае ў Польшчы беспрацоўе. Да апошняга часу, ня гледзячы на гэта, паводле ўрадавай статыстыкі лічба беспрацоўных у 250.000 знаходзілася на мёртвым пункце. Больш таго, кожны тыдзень яна паказвала зьніжэньне на 30-50 чалавек.

Цяпер тэмпы росту беспрацоўя настолькі відавочныя, што нават урадавая статыстыка прымушана гэта адзначыць. Паводле гэтай статыстыкі, на 19 сьнежня ў Польшчы было **274.218 беспрацоўных**, што складае ў параўнаньні з мінулым тыдзенем узрост на 6.08[illegible] чал. Зразумела, што гэтыя лічбы [illegible] беспрацоўя далёкі ад сапраўднасьці.

Бяльбожніцкі рух сярод сялян Косаўшчыны

ВАРШАВА. На старонкі буржуазнай прэсы што раз часьцей прарываюцца весткі аб магутным росьце масавага бязбожніцкага руху сярод сялян, асабліва на Заходняй Беларусі і Украіне.

У апошні час газэты б'юць трывогу з прычыны «пагражаючых разьмераў» бязбожжа ў вёсках **Косаўшчыны.** Сяляне-байкатуюць цэрквы і касьцёлы, прагняюць з вёсак папоў і ксяндзоў. Гэты рух асабліва шырока разгорнут у волясьцях: **Кабацкай, Слабодзкай, Рыбнай і Рожнавай.**

Сярод сялян і асабліва моладзі растуць упывы і аўтарытэт кампартыі і камсамолу.

Бязбожніцкі рух у вёсцы — надзвычайна характэрнае зьявішча. Ён сьведчыць аб далейшым паглыбленьні клясавай сьвядомасьці працоўнага сялянства. Клерыкалы — **«духоўныя» і простыя агенты дэфэнзывы**—трацяць пад нагамі грунт. Іх чорная роля ў барацьбе фашысцкай дыктатуры супроць кожнага найменшага праяўленьня рэвалюцыйнай барацьбы рабоча-сялянскіх мас — зрабілася зусім відавочнай. Трапчаць спрадвечныя надпоры эксплёатацыі — рэлігія, «богабоязнь» мас.

Працоўныя адыходзяць ад рэлігіі — зброі контр-рэвалюцыйнай буржуазіі, нарываюць з яе агенгамі ў сутнах і становяцца на шлях рэвалюцыйнай барацьбы пад гегемоніяй пралетарыяту, пад кіраўніцтвам яго авангарду — кампартыі.

Загнапад латвійскага экспарту

РЫГА, 18. Новы латвійскі прэм'ер Скуэнэк сказаў па радыё зрэмаву, у якой, між іншым, адзначыў, што за апошнія месяцы латвійскі экспарт значна ўпаў і складае зараз ня больш адной чацьвертай або адной трэцяй частні рамёснага аб'ёму. Няма больш попыту на лён, масла і іншыя с.-г. прадукты. Урад уводзіць крызісны падатак, увесь цяжар якога кладзецца на гарадзкое насельніцтва. Адмак, ня гледзячы на ўсе ўжытыя меры, бюджэт гэтага году, як відаць прыдзецца заключыць з дэфіцытам і гэта прымусіць урад пры складаньні бюджэту на 1932-33 год зрабіць яшчэ большыя скарачэньні. (ТАСС).

Стан узбраеньняў капіталістычных дзяржаў

БЭРЛІН, 23. 24 краіны — члены Лігі нацый — прыслалі ў Лігу нацый афіцыяльныя даныя аб становішчы сваіх узбраеньняў на 1930-31 г.

Згодна гэтых даных самую вялікую армію мае **Францыя**, дзе рэгулярная армія разам з вайсковымі арганізацыямі налічвае **692.366 чал.** Сюды трэба, апрача таго, аднесьці 4,5 млн. навучаных салдат запасу.

На другім месцы стаіць **Італія** з арміяй **у 500.000 чалавек.** Польшча мае **330.000** салдат і **2,5 млн. навучаных салдат запасу,** Румынія — 315 тыс. салдат, Англія — **304.000,** Японія—**270.000,** Югаславія— **223.000,** Гішпанія **152.000,** ПАЗШ — **154.000,** Чэха-Славакія — **140,900,** Бэльгія, **88.000** і Германія — **100.000.**

***

БЭРЛІН, 23. У германскіх палітычных колах выклікалі вялікі перапалох весткі аб спробах Англіі, прадпрынятых у Парыжы і Токіё, набіцца адтэрміноўкі канфэрэнцыі па разбраеньні. У Бэрліне баяцца, што англійскія намаганьні могуць скончыцца з посьпехам у японскага ўраду, бо Японіі будзе лягчэй заявіць, што ў момант, калі яна змагаецца за сваю ўладу ў Манчжурыі, дык ня можа гаварыць аб разбраеньні. Як паведамляюць, Японія заявіла, што для яе канфэрэнцыя па разбраеньні мае толькі тэарытычнае значэньне. У правых германскіх колах лічаць, што іменна Францыя зьяўляецца ініцыятарам гэтай тонкай гульні і што ролі былі размеркаваны ў Парыжы. У Бэрліне з зацікаўленасьцю чакаюць, на якія ўступкі пойдзе Францыя, каб адцяжваць Англіі за гэту інсцэніроўку.

Паведамленьні

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Віцебску 2-1—32 г. будзе працаваць вызнаная ПТ ЦКК пад старшынствам тав. Блоштэйна, на якую выклікаюцца наступныя т. т.: Горын І. В., Курмас Ф. Т., Старавойтаў Т. А., Старавойтаў П. С., Шабеко К. П., (6. Бел. арм.), Солнцаў А. Г., Гудзін Я. Я., Беркер К. Ш., Зубец Ф. І., Мішурын П. К., Сучкоў І. М., Харытовіч К. З., Прыжэвальскі Ф. А., Мушкін І. Л., Насевіч П. І., Шпоік М. Е., Баўчуліс М. У., Багданаў Р. А., Фекто Р. Я., Краўле Ф. Э., Зарэцкі І. І., Гулецкі І. П., Ефрэменка П. М., Тапорскі М. А., Канцелеў Е. М., Мандрыкс М. Я., Конюхаў П. Л., Чарнеў П. І. Яўка выкліканых абавязкова. Праезд за свой кошт.

— Дом Пісьменьніка. 26 сьнежня, у 7 гадз. веч., пісьменьнік В. Станкэвіч будзе чытаць сваю новую п'есу (рэпэртуар БДТ-2). Уваход вольны.

— 1 студзеня 1932 г., у 7 гадз. у Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68) адбудзецца сход адказных рэдактароў Дзярж. Выд. Бел. па пытаньні «Ліст тав. Сталіна і задачы выдавецкай работы».

На нараду павінны зьявіцца т. т. Бучукас, Белашоў, Вялуга, Вулзін, Вансоўскі, Вітлін, Гаруновіч, Дрэлёнак, Курцік, Канаплін, Красіна, Кучынскі, Калента, Канакоцін, Ляўкоў, Лур'е, Лынькоў, Міцькоў, Мышак, Платун, Плешакоў, Потап, Рэвяскі, Рэскін, Рыбалін, Старавойтаў, Саевіч, Шчарбакоў, Шостакоў, Чарнушэвіч, Пэмпынэр, Ляўша, Краўцоў, Паніматка, Шушкевіч, Протасеня, Ганчарык, Ільюшонак, Самусевіч, Булгак, Мяцельскі, Войцішак, Баркоўскі, Стрэле, Горын, Брыгаскевіч, Валабрынскі, Мгулькік, Дунец, Альтман, Зарэмбскі, Адамсон, Вілунас, Гурскі, Шкільтэр, Кмыс, Галавач, Вэндэ, Пракапчук, Панкевіч, Лазаронка, Керштэйн, Гершэльман, Нікалаеў, Гершман, Бронштэйн, Опараў, Чарнабродаў, Вэр, Зюзькоў, Гурэвіч, К., Мельцэр, Ракаў, Гохман, Немец, Сумараў, Гімельфарб, Аксельрод, Голанд, Барал, Скіцкі, Заслэнкер, Кавароў, Варыюсева, Гурэвіч Л., Гурэвіч (ЦКК), Эйдальман, Сьлэзкова, Лабадаеў, Шпактараў, Клінковіч, Каменштэйн, Рыжкаў.

На нараду запрашаюцца пісьменьнікі, мастакі, перакладчыкі, аўтары.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б, ДЗБ.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Брыгада „Зьвязды" і рэдакцыя газэты „Бальшавіцкі сьпіс" з удзелам трыкутніка трэцяга чыгуначнага раёну

АРГАНІЗУЕ

28-га сьнежня ў 7 гадз. вечара, у клюбе „Настрыміён" (ст. Ворша) масавы вытворчы вечар паравозных брыгад, дыспэтчараў, дзежурных на станцыі і галоўных кандуктароў Аршанскага вузла па пытаньні перадачы вопыту лепшых паравозных брыгад.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Пач.: 6, 7-30, 9 і 10-30. — Мастацкі фільм **Праект Інжынэра Стронга** (шырокі экран)

„Культура" Пач.: 7, 8-45, 10-30 — **БІЧ ЧАСУ** у 6 частках. Звыш праграмы зменная камэдыя **Паездка на дачу.**

„Інтэрнацыянал" — Мастацкі фільм **Востраў бегляцоў** Звыш праграмы—ХРОНІКА.

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня — Мастацкі замежны фільм **ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ** Звыш праграмы—ХРОНІКА

„Юны Піянэр" (будзінак кіно „Культура") — Новы мастацкі фільм **ІХНІЯ ВУЛІЦЫ** Пач. 1-е, 2-30, Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 Каса—ад 5 гадз. — Сёньня вядомы фільм **„Коллежский регистратор"** У гал. ролі вядомы артыст Мозжухін.

„Інтэрнацыянал" — Мастацкі фільм **Востраў бегляцоў** Звыш праграмы— кіно-хроніка Саюзкіно

Менская гарадзкая партызанская камісія

прапануе ўсім чырвоным партызанам і чырвонагвардэйцам, якія ў сучасны момант жывуць у г. Менску,

узяцца на вучот у 3-дзенны тэрмін.

(Гарслвет, пакой 24). Тым, што на зьявіцца на вучот, ня будуць прыходзіць выстку ў Менску, і іх партызанскія білеты будуць лічыцца несапраўднымі.

Для экспэртызы жывочна-мясных прадуктаў

патрэбны

Інструктары па якасьці масла і выравады.

Праца ў гарадох БССР пры базах. Пэнсія да 200 руб. у месяц. З прапановамі зварачэнна: Менск 38, Крыжаўкіна дзяржаўная малочна-масьлянай інспэкцыі Бел. Звяхоцкага раёну.

Аграном **Шукае пакой** АПЛАТА па згодзе. Заварачацца: НКЗ Бел., карнаны сэктар, вул. № 5-33.

1-га студзеня 1932 г. у г. Менску

(памяшканьне клюбу харчавікоў—рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай вуліц)

— СКЛІКАЕЦЦА —

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД Т-ва Чырвонага Крыжу БССР

з наступным парадкам дня:

1. Даклад аб міжнародным і ўнутраным становішчы і аб чарговых задачах Саюзу т-ва Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР.
2. Справаздачны даклад ЦК т-ва Чырвонага Крыжа БССР і сэкдаклад цэнтральнай рэвізійнай камісіі т-ва.
3. Зацьвярджэньне статуту т-ва Чырвонага Крыжа БССР.
4. Зацьвярджэньне кантрольных лічбаў на 1932 г. і выказаньне каштарысу за 1931 г.
5. Выбары ЦК т-ва Чырвонага Крыжа БССР і рэвізійнай камісіі.

Да адкрыцьця зьезду прыстасоўваецца тыраж II разраду 1-й Усесаюзнай лётарэі Саюзу т-ва Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР.

Прапануецца ўсім раённым і гарадзкім камітэтам т-ва Чырвонага Крыжа, якія яшчэ да гэтага часу не правялі канфэрэнцый, правесьці іх і абрасьці дэлегатаў на зьезд з паведамленьнем аб гэтым ЦК т-ва.

Адначасова закончыць збор сродкаў за лётарэю і грошы перавесьці на бягучы рахунак лётарэйнай камісіі ЦК т-ва № 86-919.

Арг. камісія ЦК т-ва.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСНА на 1932 год на краязнаўчую часопісь

„САВЕЦКАЯ КРАІНА"

орган масавага сэктару БАН цэнтральнага бюро краязнаўства

Умовы падпіскі:

На год —1 р. —
„ 9 мес.—3 „ 25 к.
„ 6 „ —2 „ 25 к.
„ 3 „ —1 „ 25 к.
„ 1 „ — „ 50 к.

Цана асобнага нумару 50 к.

Падпіска прымаецца на пошце у раённых кнігарнях і у раённых бюро краязнаўства.

ДЗЯРЖБАНК

даводзіць да ведама насельніцтва, што ім

АДКРЫТ ПРЫЁМ

ад полісатрымальнікаў

ПОЛІСАУ

амэрыканскага страхавога таварыства „Нью-Ёрк" для атрыманьня па імгроший у Амэрыцы і выдачы іх уладаром полісаў як грашыма, так таварам з фондаў ТОРГСІНУ. За ўсімі даведкамі па гэтым пытаньні належыць зварачацца ў зонежны аддзел Дзяржбанку. Прыём полісаў квітоў страхавых узносаў будзе праводзіцца Дзяржбанкам **толькі да 1-га лютага 1932 г.**

Дзяржбанк Беларускае канторы.

Аб'яднаная Беларуская вечерняя школа

ПАТРАБУЮЦЦА

чарцёжнік і машыністка.

Дагаварыцца з навучальнай часткай.

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Праўленьне МЦРК даводзіць да ведама ўсіх установаў, фабрык і заводаў, якія складаць на забесьпячэньні Менскага Цэнтрабкопу, што яны павінны ПРАДСТАВІЦЬ СЬПІСЫ У СТОЛ ПАЙШЧЫКАЎ па наступнай форме:

№№ чарг.	Прозьвішча, імя і імя па бацьку	№ пасьвідчаньня	Пасада	Сьпіс забесьпячэньня	Катэг. забесьпячэньня	Лік утоды навіцу зьвыш 12 гадоў	Дзеці да 12 гадоў

Сьпісы павінны быць завераны мясцовымі камітэтамі і адміністрацыяй. Сьпісы павінны быць прадстаўлены **не пазьней 26-XII-31 г.**

У выпадку непрадстаўленьня да вышэйпаказанага тэрміну, будзе тормаз у выдачы наборных дакумантаў і своячасовым забесьпячэньні.

Праўленьне МЦРК.

АНОНС!

Гэтымі днямі ў гукавым кіно-тэатры **„Чырвоная Зорка"** аднаўляецца настаноўкай лепшы гукавы фільм

ЗЛАТЫЯ ГОРЫ

Слухайце і глядзеце лепшы гукавы фільм.

Н. ГОРДЗІН

МЕНСК ПАВІНЕН ПАКАЗАЦЬ УЗОР БАРАЦЬБЫ З АУТААВАРЫЙНАСЬЦЮ, ЗА ПРАВІЛЬНЫ ВУЛІЧНЫ РУХ

Лёзунг «пасадзіць СССР на аўтамабіль», у сувязі з пускам заводу імя Сталіна («АМО») і бліжэйшым адкрыцьцём Ніжэгарадзкага аўтагіганту, пачынае хутка ператварацца ў жыцьцё. Колькасьць аўтамабілёў у БССР, у параўнаньні з 1929 г., патроілася. Аўтатранспарт абнаўляе новымі маркамі машын як імпартнымі, так і нашай вытворчасьці. Аўтамабіль пачынае заваёўваць сабе належнае месца ў агульнай сыстэме народнай гаспадаркі.

Адмак, аўтатранспарт у радзе месц пазуль ідзіна спраўляецца з пастаўленымі перад ім задачамі. Асабліва гэта адчуваецца зараз—у перыяд разгару зімовых перавозак, калі мы, здавалася-б, павінны былі асабліва цаніць наяўны аўтатранспарт і клапаціцца адносіцца да кожнай машыны, якая атрымліваецца з вялікімі цяжкасьцямі.

Агульныя лічбовых даных аб аварыях на аўтатранспарце няма, але і тыя, што ёсьць, далёка нашоўныя весткі даюць яркі малюнак «ухарскіх» адносін некаторых шофэраў да машын. Толькі за апошнюю дэкаду ў Менску зарэгістраваны пастуныя катастрофы і аварыі, ня лічачы тых, што па якіх бы там ня было прычынах невядомы органам міліцыі.

Аўтамабіль Я-5 Галоўдартрансу, які ішоў з Трасьцянца ў Менск, па дарозе пасхочыў на каток, адскочыў і... авалтуся ў роў.

Грузавы форд пасхочыў на слуп. Машына разьбіта.

2 форды сутыкнуліся. Абедзьве машыны пакасаваны.

Форд сутыкнуўся з грузавой машынай «АМО». Абедзьве машыны выведзены са строю.

Форд аўта-школы, які ішоў пад кіраўніцтвам інструктара, пасхочыў на фурманку Цэнтрасыпірту. Забіт конь. Машына пакасаваная.

Машына Я-5, па віне шофэра, перакруцілася на Магілеўскай шашы. 2 чалавекі забіты.

«Яраслаўка» аднаго з атрадаў Галоўдартрансу пасхочыла на фурманку, якая ішла насустрач. У выніку забіта жанчына, паранен селянін і забіт конь. Машына так хутка ішла, што забітая жанчына праехала на радыятары некалькі дзесяткаў мэтраў, пасьля чаго шофэр опыніўся, скінуў яе з радыятару і паехаў далей.

Дзе прычыны аўтамабільных катастроф і аварый?

Калі пры няшчасных выпадках у горадзе мы гаворым, што тут вінаватва многіх выпадках пешаход, дык гэтым ні ў якім выпадку нельга тлумачыць катастрофы, якія бываюць за горадам. Трэба проста сказаць, што асноўнае зло карэніцца ў слабой работе з шофэрамі і слабой ва многіх месцах дысцыпліне апошніх.

Сотні аўтамабіляў, так неабходных нам ва ўмовах вострага недахопу транспарту, штогодна выбываюць са строю з-за барбарскіх адносін да машыны. І гэта ў той час, калі мы тратім яшчэ валюту на завоз запасных частак да імпартных машын.

Аб значэньні аўтамабілю ў раёне (сувязь з сельсаветам, калгасамі, абслугоўваньне загатовак, пасеўнай і ўборачнай кампаній) гаварыць ня прыходзіцца. Калі-ж да гэтага ўлічыць цяжкасьці, якія ёсьць на сёньняшні дзень у спажываньні раённай машынамі, дык здавалася-б, за аўтамабілем павінен быць устаноўлены самы пільны догляд. Між тым, за апошні месяц па віне шофэраў згарэлі 2 форды — у Глускім і Прапойскім РВК. У Глуску — з-за таго, што шофэр поўчу наліваў бензін пры сьвятле ліхтара, а машына стаяла ў хлеве з сенам. У Прапойску — проста з-за нядбайных адносін да машыны.

Адной з прычын вулічных няшчасьцяў зьяўляецца ня веданьне або нескаданьне ведаць правілы вулічнага руху. Шофэры скардзяцца, што брук знаходзіцца ў руках пешаходаў, што пешаход не дае машыне дароги, а паадварот — машына павінна яго аб'яжджаць. Насельніцтва ў асноўнай масе ня ведае правілаў вулічнага руху. Ды і ня толькі насельніцтва. Міліцыянэры, рэгулюючыя рух, — і тыя часам гэтых правілаў ня ведаюць. Машыны ідуць бяз нумароў, без сьвятла, яўна без тармазоў, — але міліцыянэр іх бесклапотна прапускае. Адмак, ва многіх выпадках вінаваты і важатыя. Шалёная язда, поўнае ігнараваньне правілаў руху, «ухарства» — самыя распаўсюджаныя факты.

Асабліва недысцыплінаваны гужавы транспарт. Па пэўных магістралях у нас прапускаюцца ня толькі аўтамабільны і гужавы транспарт, але і сялянскія фурманкі. У выніку — пагібель людзей, коняй, паломка машын, сутыкі з трамваем, «пробкі» і іншыя «прыгожасьці» нерэгулявнага вулічнага руху.

Пельга прайсьці і міма нядбайнасьці адміністрацыі гаражоў, якая выпускае машыны з нясправэнымі тармазамі, без сьвятла, сьпічалаў, з шофтам руля, вібруючымі колямі і г. д.

Разьвіцьцю п'янства сярод шофэраў, а разам з тым і росту аварыйнасьці садзейнічае адсутнасьць культурных устаноў для абслугоўваньня аўтаработнікаў. Нават у Менску, дзе згуртавана значная колькасьць іх — няма аўтамабільнага клюбу, дзе шофэр мог бы культурна правесьці час, падняць сваю кваліфікацыю і абмяняцца вопытам работы з другімі аўтаработнікамі.

Якія-ж неабходны меры для барацьбы з дэзарганізатарамі аўтатранспарту, з «ухарствам» шофэраў і непаладкам у вулічным руху, для падняцьця працдысцыпліны сярод шофэраў.

Дагэтуль рэгістрацыяй аварый і катастроф займаўся Галоўдартранс. З прычыны адсутнасьці інспэктарскага апарату на месцах, большасьць аварый праходзіла міма яго ўвагі. Зарэгістраваго ўсяго ня ста 100 аварый на 600 машынах за 10 месяцаў. Гэта складае прыблізна адну зарэгістраваную аварыю на 5 машын у год. У рэчаіснасьці іх яшчэ больш, а асабліва многа аварый бывае ў часе «вучэбных» паездак, якія, амаль як правіла, не рэгіструюцца. Трэба згуртаваць вучот катастроф і аварый у органах міліцыі, і пры галоўным кіраўніцтве міліцыі стварыць адзіны орган па вывучэньні правілаў вулічнага руху, прычын катастроф і аварый. Грамадзкі кантроль за захаваньнем правілаў вулічнага руху павінны ўстаначыць у першую чаргу аўтадорафаўскія арганізацыі. Галоўдартранс павінен займацца інструктаваньнем аўтагасадаркі, палепшэньнем пастаноўкі эксплёатацыі аўтатранспарту і іншымі, усклаўшы на яго функцыямі.

Ва многіх выпадках адміністратары імкнуцца «замазаць» результаты аварый, не агалашаць справу. Дагаварваючыся з самімі вінаватымі катастрофы аб рамонце машыны, такія адміністратары тым самым стымулююць беспакаранную паломку машын. З такімі фактамі трэба павесьці рашучую барацьбу, умацаваўшы карную палітыку ў адносінах парушыцеляў вулічнага руху і дэзарганізатараў аўтатранспарту. У выпадках-жа асабліва злоснага парушэньня дысцыпліны на аўтатранспарце — арганізаваць паказальны працэс. Трэба раз назаўсёды пакласьці канец атэістасьцям, якія дагэтуль мелі месца.

Неабходна пачаць праз Аўтадор, школы, кіно, радыё, друк і інш. сродкі прапаганды — а працаю за захаваньне пешаходамі правілаў вулічнага руху, штрафаваць і прымаць больш суровых меры ў адносінах да тых, якія не падпарадкоўваюцца ўказаньням міліцыі.

У тэрміновым парадку павінны быць арганізаваны, у першую чаргу ў буйных гарадох БССР, курсы для навучаньня міліцэйскіх работнікаў кіраваньню аўтамабілем, правілам вулічнага руху. Міліцыянэр павінен ведаць, што ад яго ўменьня мацаваць залежыць цэласьць так неабходных нам аўтамашын.

Ня глядзячы на рад пастаноў Менскага гарсавету аб накіраваньні асобных патокаў руху у адзін бок, гэтыя правілы нікім не захоўваюцца. Напрыклад, зусім выразна гаварылася, што па Ленінскай і вуліцы Энгельса рух магчымы толькі ў адзін бок. Але машыны і рамізныя сьцякаюць па Ленінскай вуліцы супроць руху трамваю. Тое-ж самае і ў астатніх раёнах гораду.

Трэба зараз-жа заняцца пытаньнем накіраваньня асобных патокаў руху па паралельных вуліцах. Запрыманьня тут быць ня можа, бо кожны дзень нам прыносіць шматтысячныя страты. Адначасова неабходна, каб сьнег прыбіраўся ня толькі па Савецкай і Ленінскай вуліцах, а таксама і на тых паралельных вуліцах, куды будуць накіраваны транспартныя патокі.

Ні ў якім выпадку нельга дапускаць руху ў адным напрамку аўтамабіляў і гужу. На самых ажыўленых ратох трэба арганізаваць сьветавую сыгналізацыю, у прыватнасьці на раду Ленінскай і Савецкай, Ленінскай і Інтэрнацыянальнай і іншых вуліц.

Аўтадор БССР павінен ар